Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

28 ЛЮТАГА 2018 г. СЕРАДА № 41 (28657)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



## ШЧЫРАЕ СЛОВА КНІГІ

***Удзельнікам XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу і IV Міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час»***

**Дарагія сябры!**

Сардэчна вітаю ўдзельнікаў і гасцей XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу і IV Міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час».

Гэты форум па праве лічыцца адной з найбольш яркіх падзей у жыцці Беларусі. За чвэрць стагоддзя ён набыў шырокую вядомасць і за межамі нашай краіны.

Духоўна-маральнае развіццё грамадства з'яўляецца найважнейшай задачай беларускай дзяржавы. Немалаважную ролю ў гэтым, безумоўна, адыгрывае кніга.

Цяжка пераацаніць яе значэнне ў захаванні культурнай спадчыны пакаленняў, фарміраванні асобы і выхаванні патрыятызму, адукацыі і руху да прагрэсу.

Выключна важна, каб сумленнае і пранікнёнае слова пісьменніка заклікала да міру, узаемаразумення і гуманізму.

Жадаю ўсім плённай працы, творчых поспехаў, шчасця і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# АГУ, ВЯСНА!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхарка вёскі Даўгаполле Гарадоцкага раёна Валянціна ШЭНДЗЕЛЕВА чакае прыходу вясны ў сваёй па-веснавому аздобленай хаце.**

## *ЦЫТАТА ДНЯ*



**Сяргей КАЛЕЧЫЦ, намеснік старшыні праўлення Нацыянальнага банка:**

*«Па стаўцы рэфінансавання тыя прагнозы, якія ёсць у асноўных напрамках грашова-крэдытнай палітыкі, ужо агучваліся — да 9,5 % на выніках года. Мы лічым, што сітуацыя дазволіць нам выйсці на гэты ўзровень. Удакладню, што рашэнне аб тым, які канкрэтна крок змянення стаўкі рэфінансавання будзе прымяняцца, будзе залежаць ад эканамічнай сітуацыі. Вядома, павялічвацца крок наўрад ці будзе, але ў плане змяншэння гэта цалкам магчыма, таму што мы ўжо наблізіліся да такіх разумных лічбаў, калі пачынаюць дзейнічаць узроўні тонкай настройкі. Калі і наколькі будзе зніжацца стаўка рэфінансавання — гэта пытанне тактыкі Нацбанка. Кожны раз мы прымаем ці не прымаем рашэнне ў залежнасці ад таго, як ацэньваецца цэлы комплекс фактараў, сітуацыя на рынку».*

ISSN 1990 - 763X

■ Чалавек і справа

## «Чым больш атрымліваеш, тым больш трацiш»

**21-гадовы даяр расказаў аб зарплаце ў 1700 рублёў**



Фота Анастасіі ГРУК.

**Нашу ўвагу заўсёды прываблiваюць незвычайныя рэчы i з'явы. А цiкавасць да людзей узнiкае тады, калi яны чымсьцi не падобныя да iншых: сваiмi захапленнямi цi прафесiйнай дзейнасцю, напрыклад.**

СТАР. 9

## СЛУЖБА «112» СЛУХАЕ




### ЯК ПРАЦУЮЦЬ ДЫСПЕТЧАРЫ МНС

**У цэнтры Мінска ёсць невялікі двухпавярховы будынак, схаваны ад вачэй цікаўных мінакоў. Гэта — святая святых Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС, Цэнтр аператыўнага рэагавання. Тут працуюць дыспетчары, якія штодня прымаюць тысячы тэлефонных званкоў аб надзвычайных сітуацыях, што адбываюцца ў межах двухмільённага мегаполіса. На іх першымі кладзецца ўвесь псіхалагічны цяжар службы ратавальнікаў.**

Мы гутарым з **дыспетчарам Цэнтра аператыўнага рэагавання Мінскага гарадскога ўпраўлення МНС Крысцінай ГІЛЕВІЧ.** Здаецца, хвіліны не праходзіць, каб на селектары не загарэлася чырвонае святло, не прагучаў чарговы тэлефонны званок і не пачуўся голас дыспетчара — «Дзяжурная служба МНС. Чым вам дапамагчы?» Дзяўчына працуе дыспетчарам не так даўно — тры месяцы. Але ўжо і за гэты час ёй ёсць што расказаць.

— Так, днём не бывае і пяці хвілін, каб мы пасядзелі ў спакоі, без званкоў. Увогуле, працоўная змена пачынаецца а восьмай раніцы і доўжыцца суткі. У пачатку змены мы прымаем ад папярэднікаў страявыя запіскі аб наяўнасці людзей і тэхнікі ў падраздзяленнях. Гэта трэба для таго, каб правільна размяркоўваць пераадрасаваныя выклікі. Але на гэты час работа, вядома, не прыпыняецца, і мы прымаем званкі... Спачатку апрацоўваць іх было крыху страшна, бо не ведаеш, чаго чакаць. Але работа ёсць работа.

***— Ці шмат да вас трапляе званкоў не па адрасе?***

— Мы да іх ставімся не вельмі добра. Яны нам «засмечваюць» лінію. Пры гэтым у іншым месцы можа адбывацца пажар, дзе спатрэбіцца наша дапамога. Вось літаральна некалькі дзён таму я прыняла званок, падчас якога прасілі... разблакаваць сім-картку мабільнага тэлефона. Здавалася б, якое дачыненне да гэтага маюць ратавальнікі? Але справа ў тым, што нумар 112 будзе даступны з мабільнага заўжды, незалежна ад таго, актыўная там сімка ці заблакавана. Гэта міжнародны стандарт.

СТАР. 4

# Бяспека для кожнага

**Забеспячэнне правапарадку і аховы грамадзян абмеркавалі ўчора на пасяджэнні Савета Бяспекі. Кіраўнік краіны Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што мінулы раз гаворка ішла аб умацаванні абараназдольнасці дзяржавы і былі дадзены канкрэтныя даручэнні ўраду, дзяржсакратарыяту, міністру абароны і іншым службовым асобам. Гэтым разам абмеркавалі ўнутраную бяспеку, у тым ліку барацьбу з бытавой злачыннасцю і наркотыкамі.**

Нягледзячы на агульнае паляпшэнне крыміналагеннай сітуацыі, застаюцца праблемныя пытанні. Адно з іх — бытавая злачыннасць. «Мною неаднаразова акцэнтавалася ўвага на яўна недастатковых мерах па папярэджванні і спыненні бытавой злачыннасці, асабліва гвалту ў сям'і, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Удумайцеся, амаль трэць забойстваў адбываецца на бытавой глебе». Гэта, дарэчы, і паказчык працы міліцыі. Кіраўнік дзяржавы лічыць, што кожны павінен адчуваць сябе абароненым, у тым ліку і ў сям'і.

Іншы праблемны момант — алкаголь. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што не з'яўляецца прыхільнікам забарон. Але, на думку Прэзідэнта, неабходны жорсткія меры адказнасці за розныя віды правапарушэнняў: ад з'яўлення ў нецвярозым стане ў грамадскіх месцах да здарэнняў, калі па віне п'янага кіроўцы гіне чалавек. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу і на тое, што атрымаць дакумент на кіраванне аўто не так складана. Адказнасць павінна быць вышэйшай і за выдачу даведак, і за падрыхтоўку кіроўцаў.

Яшчэ адно важнае пытанне — барацьба з незаконным абаротам наркотыкаў. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што неабходна змагацца супраць тых, хто пастаўляе такія рэчывы ў Беларусь, — гэта галоўныя злачынцы. Барацьба з тымі, хто ўжо ўжывае наркотыкі, ці з дробнымі збытчыкамі паляпшае статыстыку, але не дасягае кораню праблемы. «Патрабую ад усіх праваахоўных структур не захапляцца ведамаснай статыстыкай. Трэба выкарыстоўваць яе для аналізу, але не для самасупакаення», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Наступны момант — барацьба з карупцыяй. Прэзідэнт адзначыў, што не ўсе праваахоўныя органы працуюць эфектыўна ў гэтым кірунку.

Таксама кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што «важную задачу па ахове грамадзян вырашаюць органы і падраздзяленні па надзвычайных сітуацыях. Іх дзейнасць павінна і далей развівацца і ўдасканальвацца». Прэзідэнт падкрэсліў, што чакае па ўсіх пытаннях канкрэтных прапаноў ад членаў Савета Бяспекі.

Пасля пасяджэння генеральны пракурор Беларусі Аляксандр Канюк пракаментаваў для журналістаў асноўныя моманты, якія абмяркоўваліся з кіраўніком дзяржавы. Ён адзначыў, што гвалт у сям'і — гэта вельмі сур'ёзная праблема, над вырашэннем якой працуюць усе праваахоўныя органы. Неабходна звяртаць увагу не толькі на злачынствы, але і ўвогуле на бытавое хуліганства. У процідзеянні наркаманіі, як лічыць Аляксандр Канюк, неабходна выходзіць на дылераў. Статыстыка па выяўленні злачынстваў ідзе ўгору, але трэба змагацца з тымі, хто гандлюе наркатычнымі рэчывамі оптам.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

## Канкурэнцыя сярод «мабільнікаў»

**На нарадзе аб перспектывах развіцця рынку тэлекамунікацыйных паслуг у Беларусі абмеркавалі развіццё канкурэнцыі ў галіне. Так, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў нас ужо ёсць тры кампаніі: дзве буйныя і трэцяя, якая просіць аб падтрымцы. «Размова ідзе аб прыватызацыі некалькіх працэнтаў, якія знаходзяцца ва ўласнасці дзяржавы, кампаніі «БеСТ», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.**

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што многія называюць рэвалюцыйнымі рашэнні, якія прымаліся летась наконт развіцця інфармацыйных тэхналогій, але трэба ўспомніць, што ПВТ пачынаўся каля дзесяці гадоў таму. «Ствараючы гэты парк, мы якраз разлічвалі на тое, што ён нам спатрэбіцца. І сапраўды, ён стаў базай і асновай для далейшага развіцця інфармацыйных тэхналогій», — нагадаў Прэзідэнт. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы адзначыў, што «адным з базавых элементаў, якія ўплываюць на хуткасць і маштаб інфарматызацыі, з'яўляецца стан і развітасць інфраструктуры перадачы даных». Наша краіна займае 21-е месца па ўзроўні пранікнення шырокапалоснага праваднога інтэрнэту, але мабільны сегмент пакуль адстае. На нарадзе абмеркавалі пашырэнне інвестыцыйнага супрацоўніцтва з сусветнымі лідарамі ў гэтай сферы.

Наконт прыватызацыі Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўсё павінна вырашацца па законе: ёсць агульнапрынятая практыка конкурсу. Магчыма, з'явіцца інвестар, які зможа здзейсніць больш выгадныя ўмовы. «Таму давайце разгледзім гэтыя пытанні па канкрэтных кампаніях і зробім для сябе адпаведныя высновы», — падвёў вынік кіраўнік дзяржавы.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

## Адбылася тэлефонная размова прэзідэнтаў Беларусі і Украіны

**Аляксандр Лукашэнка і Пётр Парашэнка абмеркавалі развіццё гандлёва-эканамічных адносін, адзначыўшы іх актывізацыю і станоўчую дынаміку па выніках мінулага года, і выказалі нацэленасць на далейшае пашырэнне ўзаемадзеяння ў эканоміцы.**

Асобна Аляксандр Лукашэнка і Пётр Парашэнка абмеркавалі ход падрыхтоўкі да I Беларуска-ўкраінскага форуму, паведамляе прэс-служба беларускага лідара. Ён, як плануецца, пройдзе ў Гомелі ў кастрычніку гэтага года. Ужо сёння дасягнутыя дамоўленасці аб форме правядзення дадзенага мерапрыемства. Яшчэ адной тэмай размовы стала развіццё ўзаемадзеяння ў сферы культуры. У прыватнасці, гаворка ідзе аб правядзенні Дзён культуры Украіны і ў цэлым аб удзеле ўкраінскіх артыстаў у шэрагу папулярных беларускіх фестываляў, такіх як «Славянскі базар», «Александрыя збірае сяброў».

## Будзь у курсе!

### Дадатковыя цягнікі да Вільнюса

**Для перавозкі пасажыраў у перыяд вялікіх сакавіцкіх выхадных Беларуская чыгунка разам з АТ «Літоўскія чыгункі» прызначылі 8 і 9 сакавіка дадатковыя цягнікі ў зносінах Мінск — Вільнюс.**

Як паведамілі ў прэс-службе магістралі, цягнік № 801 па маршруце Мінск — Вільнюс адпраўціца са станцыі Мінск-Пасажырскі ў 8.10 і прыбудзе ў сталіцу Літвы ў 10.59. З улікам розніцы ў гадзінных паясах час у дарозе складзе 3 гадзіны 49 хвілін. Назад цягнік № 802 Вільнюс — Мінск адпраўціца з Вільнюса ў 20.17 і прыбудзе ў Мінск у 1.05 наступных сутак, час у дарозе складзе 3 гадзіны 48 хвілін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Што ў свеце робіцца

### ПРАКУРАТУРА ЗАПРАСІЛА 30 ГАДОЎ ТУРМЫ ДЛЯ ЭКС-ПРЭЗІДЭНТА ПАЎДНЁВАЙ КАРЭІ

Сама экс-прэзідэнт на пасяджэнні суда не прысутнічала. Яна адмовілася наведваць слуханні пасля таго, як у кастрычніку мінулага года суд падоўжыў яе арышт, нагадвае «Інтэрфакс». Па інфармацыі агенцтва Yonhap, пракуратура таксама запатрабавала аштрафаваць экс-прэзідэнта на 110,4 млн долараў. Чакаецца, што прысуд у дачыненні да Пак Кын Хе будзе вынесены напрыканцы сакавіка, перадае ТАСС. Раней яе блізкую сяброўку — Цой Сун Сіль — асудзілі да 20 гадоў турэмнага зняволення па абвінавачванні ў карупцыі і ўмяшанні ў палітычныя справы краіны.

### РАСІЯ ПАДНЯЛАСЯ НА ПЯТАЕ МЕСЦА Ў СВЕЦЕ ПА ЗАПАСАХ ЗОЛАТА

Пра гэта паведамляе Bloomberg. Як нагадвае агенцтва, запасы манетарнага золата ў міжнародных рэзервах Расіі ў студзені выраслі да 1857 тон. Такім чынам, Расія апярэдзіла па гэтым паказчыку Кітай з яго афіцыйна заяўленымі 1843 тонамі. Адзначаецца, што РФ павялічвала запасы штомесяц з сакавіка 2015 года, у той час як КНР апошні раз паведамляла аб куплі золата ў кастрычніку 2016-га. Цяпер найбуйнейшым суверэнным трымальнікам золата ў свеце з запасам у аб'ёме 8134 тоны з'яўляюцца ЗША. Другое месца займае Германія (3374 тоны), трэцяе — Італія (2452 тоны), далей ідзе Францыя (2436 тон).

### У ВЫНІКУ ЗЕМЛЯТРУСУ Ў ПАПУА — НОВАЙ ГВІНЕІ ЗАГІНУЛА БОЛЬШ ЗА 30 ЧАЛАВЕК



Землятрус магнітудай 7,5 бала адбыўся на ўсходзе вострава Новая Гвінея. Загінуў па меншай меры 31 чалавек. Пра гэта паведамляе газета Post Courier. Па інфармацыі выдання, ад падземных штуршкоў пацярпела каля 300 чалавек. Стыхія разбурыла вялікую колькасць будынкаў. Па звестках аўстралійскіх сейсмолагаў, ачаг землятрусу залягаў на глыбіні 9 км. Эпіцэнтр знаходзіўся за 104 км на захад ад горада Мендзі, насельніцтва якога складае каля 50 тысяч жыхароў. У правінцыях Хэла і Саўзерн-Хайлендс парушана электразабеспячэнне і адменены авіярэйсы. Да ліквідацыі наступстваў землятрусу прыцягнутая армія. Вядзецца разбор завалаў, аднаўляецца падача электраэнергіі.

## Тры пытанні да ўлады

# З клопатам пра малую радзіму

**Клімавіцкі раён становіцца ўсё больш прывабным для вядзення бізнесу. Штогод тут адкрываецца па 10 малых прадпрыемстваў. А сёлета раёнам зацікавіўся літоўскі бізнесмен Відмантас Кучынскас, прэзідэнт групы кампаній ARVI, якая аб'ядноўвае больш за 20 прадпрыемстваў у Літве, Латвіі, Расіі, Румыніі і іншых краінах. Ён збіраецца рэалізаваць тут праект коштам каля 50 мільёнаў долараў па вытворчасці мяса індычкі. Рабіць свой край багацейшым і прыгажэйшым дапамагаюць і яго ўраджэнцы. Старшыня Клімавіцкага райвыканкама Васіль ЗАХАРЭНКА расказаў больш падрабязна пра тое, як сёння развіваецца раён.**



***— Васіль Аляксеевіч, літоўскі інвестар настроены пачаць сваю дзейнасць ужо ў сакавіку. Як раён падрыхтаваўся да таго, каб стварыць умовы для рэалізацыі гэтага праекта?***

— Нашы інвестары будуць працаваць у рамках Указа № 235 «Аб сацыяльна-эканамічным развіцці паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці», які прадугледжвае адпаведныя прэферэнцыі. Са свайго боку мы прапануем ім усе неабходныя аб'екты інжынерна-транспартнай інфраструктуры. Выдзяляем для вытворчасці тры зямельныя ўчасткі на тэрыторыі былога ваеннага гарадка, які размяшчаецца за 10 кіламетраў ад райцэнтра — каля вёскі Барсукі, і адзін — непасрэдна ў Клімавічах. У Барсуках плануецца будаўніцтва 30 птушнікаў для маладняку і адкорму індычкі, а ў райцэнтры размесціцца завод па забоі і перапрацоўцы птушкі. Праект дасць магчымасць стварыць каля 100 новых працоўных месцаў. Не выключана, што для супрацоўнікаў новага прадпрыемства будзе пабудаваны спецыяльны інтэрнат. За кошт бюджэтных сродкаў інстытутам Магілёўсельбудпраект распрацоўваецца праектна-каштарысная дакументацыя на стварэнне інжынерных сетак для вышэйзазначаных участкаў. У найбліжэйшы час пачнецца іх будаўніцтва.

Яшчэ ў рамках 235-га ўказа распрацоўваюцца два праекты на Клімавіцкім камбінаце хлебапрадуктаў. Гэта лінія гранулявання для вытворчасці камбікармоў для індыкоў, якая ацэньваецца прыкладна ў 2 мільёны рублёў. І ўнікальны праект па стварэнні на камбінаце цэха па перапрацоўцы мяса гэтай птушкі. Унікальны ён таму, што ў рамках 235-га ўказа такога ніхто не робіць. Ён уключаны ў праграму фінансавання Банкам развіцця як прыярытэтны. У раёне таксама працуе некалькі прыватных прадпрыемстваў, якія карыстаюцца льготамі 235-га ўказа. Адно з іх «Экатэхнапрам», якое спецыялізуецца на дрэваапрацоўцы. Прадпрыемства актыўна развівае экспарт піламатэрыялаў.

***— Клімавічы вядомыя сваім фестывалем «Залатая пчолка». На свята прыязджае шмат замежных гасцей, завязваюцца кантакты. Потым гэтыя сувязі знаходзяць працяг?***

— Дзякуючы фестывалю пра Клімавіцкі раён ведаюць далёка за яго межамі. Для нас гэта свята вельмі значнае. Калі прыязджаюць інвестары, першае, пра што яны кажуць, дык гэта пра наш фестываль. Актыўна яго падтрымлівае наш зямляк, ураджэнец клімавіцкай вёскі Саўна Мікалай Якаўлевіч Крупінін. Зараз ён прафесар Дзяржаўнага Уральскага горнага ўніверсітэта, старшыня Бюро рэгіянальнай грамадскай арганізацыі Ханты-Мансійская рэгіянальнага аддзялення міжгаліновых эколага-эканамічных даследаванняў Расійскай акадэміі прыродазнаўчых навук. У 2012 годзе ён на сваёй малой радзіме ўстанавіў манумент у памяць жыхароў вёскі Саўна, якія пражывалі ў ёй у перыяд з 1932 па 2002 год. Зроблена капліца, добраўпарадкавана рэкрэацыйная зона для турыстычнага наведвання, закладзены сквер. Штогод 27 верасня, напярэдадні дня вызвалення Клімавіцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Крупінін праводзіць свята, прысвечанае памяці вёскі Саўна. На яго з'язджаюцца былыя жыхары, іх дзеці і ўнукі з розных раёнаў і абласцей Беларусі, Расіі і Украіны. А яшчэ Мікалай Крупінін дапамагае ўмацоўваць цесныя сувязі паміж беларускай і расійскай моладдзю.

***— Раён мае поспехі і ў сферы адукацыі, школьнікі дэманструюць высокія вынікі пры здачы цэнтралізаванага тэсціравання.***

— Сапраўды, мы некалькі гадоў запар займаем першае месца ў вобласці па выніках цэнтралізаванага тэсціравання. Асноўны ўпор робіцца на захаванне прынцыпаў роўнага доступу да атрымання якаснай адукацыі, усё накіравана на стварэнне неабходных умоў для фарміравання гарманічнай асобы і падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў. Па выніках 2016—2017 навучальнага года 67,7 % навучэнцаў школ маюць дастатковы і высокі ўзровень ведаў. Атэстаты асаблівага ўзору з залатымі медалямі атрымалі 15 выпускнікоў 11 класаў. У раёне праводзіцца шмат конкурсаў, акцый і мерапрыемстваў для паспяховай самарэалізацыі маладых людзей. Каля 200 юнакоў і дзяўчат мелі магчымасць летам працаваць у складзе 11 студэнцкіх атрадаў экалагічнай і сельскагаспадарчай накіраванасці, 120 навучэнцаў правялі канікулы ў лагерах працы і адпачынку. Па выніках работы раённы штаб па каардынацыі дзейнасці студэнцкіх атрадаў заняў першае месца ў Магілёўскай вобласці. Летась працоўныя калектывы нашага раёна папоўнілі 110 спецыялістаў з сярэдняй і вышэйшай адукацыяй. Наогул на першае студзеня ў раёне налічвалася больш за 4700 маладых людзей.

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

■ На слыху

# Што будзе з маршруткамі?

## У Мінтрансе запэўніваюць, што прыгнятаць прыватных перавозчыкаў ніхто не збіраецца

**З пачатку гэтага тыдня многія маршрутчыкі папярэджваюць пра збоі ў рабоце. Справа ў новым законе «Аб аўтамабільным транспарце і аўтамабільных перавозках», згодна з якім яны не могуць працаваць так, як раней. Прыватныя перавозчыкі, якія здзяйсняюць міжгародні рэйсы рэгулярна, мусяць заключыць дагавор з аператарам, адпраўляцца з вакзала, зацвердзіць графік, інтэрвал руху і прыпынкі. Прадпрымальнікі скардзяцца, што іх хочуць выцесніць з рынку. Мінтранс запэўнівае, што мэта змен у законе зусім не ў гэтым.**

### Некаторыя рэйсы адменены

Спрабуем забраніраваць месца ў прыватных перавозчыкаў. На сайце маршруткі, што адпраўляецца з Мінска ў Полацк і Наваполацк, вісіць чырвоная шыльда — «Работа прыпынена з 26.02.2018». У аўторак не выехалі таксама некаторыя аўтобусы з Салігорска.

— Можна заказаць месца на пятніцу да Баранавічаў? — цікавімся ў іншай службы перавозак.

— Так. Мы прымаем браніраванне на 16 дзён наперад. Калі нешта зменіцца, патэлефануем, — папярэдзіла дыспетчар.

Маршрутка на Гродна таксама здзяйсняе рэйсы без змен. «Пакуль працуем, — кажуць у трубцы. — Месцы па-ранейшаму можна браніраваць па тэлефоне і праз сайт».

Чаму новы закон так усхваляваў сферу перавозак? Прадпрымальнікі сцвярджаюць, што змены ў правілах пазбавяць іх крыніцы прыбытку. Так, сярод перавозчыкаў будзе праведзены конкурс на магчымасць здзяйсняць перавозкі па канкрэтных маршрутах: прыватнікі асцерагаюцца, што перавагу аддадуць дзяржаўным аўтапаркам. Часткай даходу давядзецца дзяліцца з аўтавакзаламі: яны патрабуюць 15 працэнтаў ад прададзеных праз іх білетаў.

У пасажыраў, якія прывыклі карыстацца прыватнымі маршруткамі, пытанняў таксама шмат. Няўжо давядзецца ехаць на вакзал, каб сесці ў аўтобус? Раней жа можна было папрасіць падабраць на любым прыпынку. Ці не зменшыцца колькасць рэйсаў? Цяпер па многіх напрамках ездзіць маршруткамі значна зручней. Так з Мінска ў Мазыр у будні дзень яны адпраўляюцца кожную гадзіну з 6.50 да 19.50. Білет каштуе 11 рублёў. Дзяржаўны ж аўтобус (маршрут Мінск — Лельчыцы) ходзіць да Мазыра раз на дзень, і паездка ў ім даражэйшая на шэсць рублёў. Да таго ж часта прыватнікі заязджалі ў вёскі, у якія няма рэйсаў ад аўтапаркаў.

### Усё для бяспекі пасажыраў

**Намеснік міністра транспарту і камунікацый Аляксандр ШЫШКО** адзначыў, што новы закон неабходны для павышэння ўзроўню бяспекі перавозак пасажыраў, паляпшэння якасці паслуг і стварэння дадатковых умоў для добрасумленнай канкурэнцыі.

У дакуменце ўдакладнілі крытэрыі аднясення аўтамабільных перавозак да рэгулярных і нерэгулярных. Справа ў тым, што многія рэйсы лічыліся нерэгулярнымі (і, адпаведна, не заключалі дагавор з аператарам), хоць выконваліся па пэўных маршрутах з канкрэтным раскладам. Арганізатары такіх перавозак не неслі адказнасць перад пасажырамі за несвоечасовую падачу транспарту ці адмену паездкі. Часта яны не выдавалі білет (а ён дае права атрымаць страхоўку) — толькі чэк аб прыняцці грошай.

За мінулы год было выяўлена 979 фактаў парушэння графіка працы і адпачынку для кіроўцаў аўто, 153 выпадкі допуску да работы кіроўцы, што не прайшоў перад рэйсам медагляд, 231 факт наяўнасці няспраўнасцяў, пры якіх забараняецца выязджаць на дарогу. У 44 выпадках не быў пройдзены дзяржаўны тэхагляд.

— Змены ў закон пачалі абмяркоўваць яшчэ ў 2014 годзе. Ініцыятарамі сталі афіцыйна зарэгістраваныя перавозчыкі, якія знаходзіліся ў няроўных умовах. У красавіку 2015-га законапраект быў размешчаны ў інтэрнэце для грамадскага абмеркавання. Да нас паступіла восем прапаноў, і яны былі па максімуме ўлічаны. Летась было праведзена 417 семінараў-нарад, дзе тлумачыліся змены ў законе, што неабходна зрабіць перавозчыкам, каб працаваць па новых правілах. І многія ўжо заключылі дагаворы на выкананне рэгулярных паслуг, — пракаментаваў Аляксандр Шышко.

Новы закон уступіў у сілу яшчэ з 23 студзеня. Пры гэтым пакуль нікога з перавозчыкаў, хто не заключыў дагавор, але працягвае выконваць рэйсы, з пачатку года не прыцягвалі да адказнасці.

— Ніхто не збіраецца прыгнятаць перавозчыкаў. Мы не забараняем ім самастойна прадаваць білеты пасажырам, падбіраць людзей на розных прыпынках, ездзіць па сваім раскладзе. Але пасля трэба будзе заехаць на вакзал ці дыспетчарскую станцыю, каб адзначыцца і даць адпачыць кіроўцу, — кажа намеснік міністра.

Што да напружаных маршрутаў, дзе прыватныя перавозчыкі адмянілі рэйсы (Полацк, Наваполацк і Салігорск), то там да 8 сакавіка ўключна арганізавалі дадатковыя рэйсы. Пусцілі дзяржаўныя аўтобусы, вядуць перагаворы з іншымі перавозчыкамі.

У ведамстве тлумачаць, што сумяшчаць функцыі аператара і перавозчыка ў адной асобе забаронена. А значыць, аператар не будзе зацікаўлены ў тым, каб нейкае канкрэтнае прадпрыемства выйграла ў конкурсе. Таму прыватнік на роўных умовах будзе канкураваць з аўтапаркам за права выконваць рэйсы.

— Конкурсаў не трэба баяцца. Але выйграў — выконвай патрабаванні да якасці. Або на тваё месца паставяць іншага, — пракаментаваў Аляксандр Шышко.

Ён паабяцаў, што будуць прыняты ўсе меры, каб забяспечыць перавозкамі ўсіх, хто мае патрэбу. Цяпер законам прадугледжана, што прыватнік, які хоча працаваць на сацыяльных маршрутах (заязджаць у аддаленыя вёскі, напрыклад), можа таксама атрымаць субсідыю. Гэта і для пасажыраў будзе плюсам, і зніме нагрузку з бюджэту.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ** ■

**Аляксандр ГАЕВІЧ:**

# «Без кнігі няма ідэнтычнасці...»

**У Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь прайшлі перагаворы кіраўніка ведамства з Дзяржаўным сакратаром Міністэрства культуры і інфармацыі Рэспублікі Сербія Аляксандрам Гаевічам. Удзел у размове, акрамя міністра інфармацыі Аляксандра Карлюкевіча, прынялі начальнік упраўлення выдавецкай і паліграфічнай дзейнасці Алена Паўлава, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Сербія ў Рэспубліцы Беларусь Велька Кавачавіч.**

Размова адбылася напярэдадні адкрыцця XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, дзе Сербія з'яўляецца ганаровым госцем. У Беларусь прыехала вялікая дэлегацыя сербскіх пісьменнікаў. Да выстаўкі айчынныя выдавецтвы падрыхтавалі цэлы шэраг кніжных і часопісных публікацый твораў сербскіх паэтаў і празаікаў у перакладзе на беларускую мову. Падчас перагавораў у Мінінфарме размова ішла пра перспектывы медыйнага супрацоўніцтва. Вызначаны асноўныя аспекты меркаванага пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Міністэрствам інфармацыі Беларусі і Міністэрствам культуры і інфармацыі Рэспублікі Сербія.

— Мне імпануе стаўленне беларускай дзяржавы да кніжнай культуры, — сказаў на сустрэчы спадар Аляксандр Гаевіч. — Гэтым разуменнем, што без кнігі няма нацыянальнай ідэнтычнасці, сербы і беларусы надзвычай падобныя.

Удзельнікі перагавораў пагадзіліся, што развіццё беларуска-сербскіх гуманітарных, культурных стасункаў патрабуе пашырэння. Варта ствараць новыя пляцоўкі, якія б дапамагалі нашым народам ясна ўяўляць, што дзеецца ў Беларусі і Сербіі, якімі прыярытэтамі вызначаецца дзяржаўная палітыка ў нашых краінах.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

■ Факт

# На Глыбоччыне выратавалі замежнікаў

**Моцныя халады, якія апанавалі Беларусь, ператвараюць у рулетку паездкі на аўтамабілях, якія выкарыстоўваюць дызельнае паліва. Як паведамілі ў прэс-службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, у Глыбоцкім раёне каля поўначы 26 лютага ратавальнікаў выклікаў мужчына, які разам з сям'ёй захрас каля вёскі Празарокі. Дызель загусцеў — і аўтамабіль далей ехаць не мог.**

Ратавальнікі адбуксіравалі аўтамабіль у падраздзяленне МНС, дзе дапамаглі ў рамонце «жалезнага каня» і абагрэлі людзей. Аказалася, што гэта былі замежнікі. Сям'я пастаянна жыве ў Германіі, а ў Беларусь прыехала да сваіх сяброў у госці.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК** ■

# Гэта новая гісторыя?

## Баскетбалісты зборнай Беларусі сенсацыйна абыгралі чэмпіёнаў Еўропы

**Наша каманда атрымала першую перамогу ў адборачным турніры чэмпіянату свету — 2019, абыграўшы дома зборную Славеніі з лікам 93:92.**



Першая палова сустрэчы прайшла ў абсалютна роўнай барацьбе, а затым госці здолелі адарвацца на 9 ачкоў. У сярэдзіне трэцяй чвэрці ўжо беларусы здолелі выйсці наперад на 9 ачкоў, але чэмпіёны Еўропы хутка нейтралізавалі гэты адрыў. Усё вырашыла чацвёртая чвэрць, у якой больш удачлівымі аказаліся нашы баскетбалісты, якія здолелі перайграць куды больш знакамітых апанентаў з мінімальнай перавагай.

*— Мы пішам новую гісторыю беларускага мужчынскага баскетбола, —* расказвае **галоўны трэнер зборнай Аляксандр КРУЦІКАЎ.** *— Шмат хто будзе казаць, што ў славенцаў быў не той склад, не тыя людзі, што перамагалі на чэмпіянаце Еўропы. Але вы паглядзіце ростар — там больш за палову баскетбалістаў маюць залатыя медалі кантынентальнага форуму. Нашы хлопцы праявілі характар, я вельмі задаволены. Гэта самая важная перамога на цяперашнім этапе. Гэты матч пакінуў нам шанц змагацца за трэцяе месца. У нас ёсць яшчэ дзве гульні на выездзе. Не хацеў бы, каб нас загадзя хвалілі. Мы будзем змагацца.*

У складзе беларускай зборнай самым выніковым стаў Дэван Садлер, у актыве якога 25 ачкоў, малады форвард Максім Салаш набраў 20 ачкоў.

*— У першую чаргу дзякуй балельшчыкам за неверагодную падтрымку. Дзякуючы вам і вашай энергіі мы здабылі дадатковы рэзерв сіл і змаглі атрымаць перамогу ў такім няпростым матчы. Пасля крыўднага пройгрышу іспанцам гэты поспех для нас з'яўляецца асабліва важным. Мы правялі работу над памылкамі, і я рады, што сёння мы дамагліся станоўчага выніку, —* пракаментаваў матч Максім Салаш.

Нагадаем, у першым крузе беларусы прайгралі славенцам на іх пляцоўцы з лікам 74:87, затым двойчы саступілі ў дамашніх паядынках: чарнагорцам — 67:91 і іспанцам — 82:84. Два заключныя матчы адборачнага турніру сусветнага першынства зборная Беларусі правядзе на выездзе — 28 чэрвеня ў Чарнагорыі і 1 ліпеня ў Іспаніі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**


**Уведомление о созыве очередного общего собрания акционеров ОАО «Старая фабрика»**

Наблюдательный совет ОАО «Старая фабрика» извещает акционеров Общества о проведении очередного общего собрания акционеров.

**Собрание состоится 28 марта 2018 года в 11.00 в помещении Общества по адресу: г. Минск, ул. Октябрьская, 19–19.**

**Повестка дня**

1. Избрание директора Общества.
2. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2017 году.
3. Утверждение бухгалтерского баланса и направлений использования чистой прибыли за 2017 год. Утверждение дивидендов за 2017 год.
4. Утверждение направления использования чистой прибыли, которая будет получена в 2018 году.
5. Отчет Наблюдательного совета и ревизионной комиссии о работе в 2017 году.
6. Утверждение условий материального вознаграждения членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Регистрация участников собрания состоится в день проведения собрания с 10.30 до 11.00.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность, представителю акционера – доверенность и документ, удостоверяющий личность.

УНП 100640022

**ООО «ГИРИЗ»**

**ГИДРАВЛИКА:** гидроцилиндры, насосы, распределители
РВД и комплектующие
Напорные рукава и шланги
Техпластины
Ремонт гидравлических узлов
**ДОСТАВКА ПО ВСЕЙ БЕЛАРУСИ**
Самые конкурентные цены
**В НАЛИЧИИ МНОГО ТЕХНИКИ ПО ЦЕНАМ ВЕСНЫ 2017 ГОДА**
Плуги, бороны, прицепы и полуприцепы. Запчасти к ним.
**ВОЗМОЖЕН РАСЧЕТ ВСТРЕЧНЫМИ ПОСТАВКАМИ, ДОГОВОРАМИ ПЕРЕВОДА ДОЛГА.**
+375 44 765 08 65 г. Заславль, ул. Советская, 122, каб 126
**girza.by**
УНП 691586696

■ Сацыяльная праблема

# КОЛЬКІ ПІЎ — СТОЛЬКІ ДАВЯДЗЕЦЦА ЛЯЧЫЦЦА

**Ложкі для рэабілітацыі грамадзян з залежнасцю ёсць ва ўсіх абласцях**

**Пазбавіцца ад алкагольнай ці наркатычнай залежнасці хутка немагчыма. Урачы сцвярджаюць, што колькі часу яна фарміравалася, столькі ж спатрэбіцца, каб вярнуцца да нармальнага жыцця. Умоўна кажучы, пяць гадоў піў — пяць гадоў зойме рэабілітацыя. Ці становіцца алкаголікаў менш, на якую дапамогу могуць разлічваць залежныя і чаму ім складана ўладкавацца на работу, расказалі спецыялісты.**

## Кожны пяты алкаголік — жанчына

Рэабілітацыя праходзіць у некалькі этапаў. Спачатку — ва ўстанове аховы здароўя (ад 28 да 60 дзён), потым ідзе сацыяльная рэабілітацыя. У чым сутнасць гэтых мерапрыемстваў? Нармалізаваць эмацыянальны фон чалавека і прапанаваць яму жорстка структураваны асяродак, дзе б ён быў заняты. Раней ён існаваў ад выпіўкі да выпіўкі, а цяпер мусіць вучыцца жыць па-новаму. Для кожнага распрацоўваецца індывідуальная праграма рэабілітацыі.

На сёння пад наглядам псіхіятраў-нарколагаў знаходзіцца 162 тысячы пацыентаў з сіндромам залежнасці ад алкаголю, з іх 33 тысячы — жанчыны. Што датычыцца наркаспажыўцоў, то іх на ўліку каля васьмі тысяч (яшчэ пяць тысяч знаходзяцца пад прафілактычным наглядам — у іх няма залежнасці, але яны часам ужываюць псіхаактыўныя рэчывы).

— Уся работа і па прафілактыцы, і па рэабілітацыі грунтуецца на міжведамасным падыходзе. Практыка паказвае, што толькі пры аб'яднанні намаганняў міністэрстваў ёсць вынікі, — гаворыць **загадчык Рэспубліканскага цэнтра наркалагічнага маніторынгу і прэвенталогіі РНПЦ псіхічнага здароўя Аляксей КРАЛЬКО.** — Штогод зніжаецца ўзровень эканамічных і сацыяльных наступстваў п'янства. Так, за 2016 год аб'ём ужывання алкагольных, слабаалкагольных напояў і піва ўпаў на 2,8 %. За 2017 год лічбы яшчэ падсумоўваюцца, але, паводле папярэдняй інфармацыі, тэндэнцыя захоўваецца. Летась на пяць працэнтаў знізілася колькасць памерлых ад выпадковага атручвання алкаголем, на тры працэнты зменшылася колькасць асоб з хранічным алкагалізмам, узятых пад нагляд упершыню. Жанчын з дыягназам «хранічны алкагалізм» стала на два працэнты менш. Сярод жанчын таксама скарацілася на 3,5 % колькасць алкагольных псіхозаў.

За год на 3,4 % паменела злачынстваў, здзейсненых «пад градусам», на 4,6 % — адміністрацыйных правапарушэнняў за распіццё алкаголю ў грамадскім месцы, на 5,8 % — ДТЗ па віне п'яных кіроўцаў.

— Апошнія гады мы праводзім рэструктурызацыю нашых падраздзяленняў, у прыватнасці, перапрафілюем ложкі ў бальніцах у рэгіёнах. Цяпер у кожным абласным цэнтры ёсць магчымасць прайсці рэабілітацыю на базе дзяржаўнай арганізацыі аховы здароўя. Для гэтага па краіне прадугледжана 290 ложкаў, — каментуе Аляксей Кралько.

Міністэрства аховы здароўя ўнесла таксама шэраг прапаноў у праект закона па пытаннях рознічнага гандлю алкагольнымі напоямі. «Наша ініцыятыва — не прадаваць спіртное на запраўчных станцыях, пашырыць практыку абмежавальных мер у плане яго даступнасці. Гэтыя класічныя падыходы трэба прымяняць комплексна, яны насамрэч працуюць», — упэўнены Аляксей Кралько.



## Працы няма, бо адсутнічае матывацыя

З верасня 2016 года мэтанакіраваную работу з беларусамі з залежнасцю пачалі весці тэрытарыяльныя цэнтры сацабслугоўвання насельніцтва. Яны працуюць з тымі, хто звярнуўся па дапамогу добраахвотна і папярэдне прайшоў лячэнне. ТЦСАНы ставяць такіх грамадзян на ўлік, аказваюць ім сацыяльныя паслугі, розныя віды матэрыяльнай дапамогі (як самім залежным, так і іх сем'ям).

Калі скласці сацыяльны партрэт алка- і наркаспажыўцоў, то гэта людзі працаздольнага ўзросту, без групы інваліднасці. Асноўная праблема для іх — знайсці работу. Зрабіць гэта, як правіла, перашкаджае нізкая матывацыя. Напрыклад, летась у органы па працы па дапамогу ва ўладкаванні пасля лячэбна-працоўных прафілакторыяў звярнулася 2,4 тысячы чалавек (з іх 219 — жанчыны). У выніку 1,7 тысячы знялі з уліку, у тым ліку і за няяўку ў службу занятасці на працягу двух месяцаў без уважлівай прычыны.

Летась у органы па працы звярталася таксама 26 чалавек з нарказалежнасцю (23 з іх — з Магілёўскай вобласці).

— Палова з іх мела толькі базавую ці сярэднюю адукацыю. Вядома, уладкаваць такіх людзей складана. Да таго ж у іх няма патрэбы ў працы, — заўважае **кансультант аддзела арганізацыі работы дзяржаўнай службы занятасці насельніцтва і альтэрнатыўнай службы ўпраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Жанна ШЧАМЯЛЁВА.** — Палову знялі з уліку, бо людзі не хадзілі на гутаркі на прадпрыемствы. Тэлефануеш такому чалавеку дадому — трубку здымае жонка, бо сам ён нiякі.

## Курсы для цырульнікаў пры ЛПП

Рэабілітацыя тых, хто трапіў у лячэбна-працоўны прафілакторый, пачынаецца яшчэ ў сценах гэтых устаноў. Асноўная работа — за тры месяцы да выхаду. Грамадзянам дапамагаюць сабраць патрэбныя дакументы, расказваюць пра вакансіі на прадпрыемствах. Пасля ЛПП людзі ўладкоўваюцца на работу на агульных падставах (бронь працоўных месцаў, як для асоб, што выходзяць з калоній, не прадугледжана).

Увогуле ў папраўчых установах вялікую ўвагу ўдзяляюць адукацыі асуджаных. Каля 2,5 тысячы чалавек праходзяць там прафесійна-тэхнічнае навучанне, 160 атрымліваюць дыстанцыйна дыплом універсітэта. Больш за чатыры тысячы праходзяць навучанне без адрыву ад вытворчасці. Па словах **намесніка начальніка ўпраўлення арганізацыі папраўчага працэсу дэпартамента выканання пакаранняў МУС Аляксандра КРАЛЬКО,** у планах — запусціць новы адукацыйны праект сумесна з Беларускім Чырвоным Крыжам. У ЛПП № 3, дзе знаходзяцца жанчыны з алкагольнай залежнасцю, будуць навучаць цырульніцкаму майстэрству. Гэта павысіць шанцы на працаўладкаванне (а значыць, і на сацыяльную адаптацыю) тых, хто не мае прафесіі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■

# СЛУЖБА «112» СЛУХАЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Вось людзі і набіраюць 112, каб ім вырашылі праблемы з карткай. Хоць бывае і так, што памыляюцца нумарам. Напрыклад, тэлефанавалі ў міліцыю, недагледзелі крыху — і замест «двойкі» націснулі «адзінку». Ёсць і кур'ёзы — напрыклад, нам перыядычна тэлефануюць два невідушчыя мужчыны, каб даведацца, якая зараз гадзіна.

***— Загарэлася чырвоная кнопка на селектары. Што вы робіце далей?***

— Напрыклад, нам паведамілі, што недзе адбываецца пажар. Нам трэба па спецыялізаваным алгарытме высветліць усю неабходную інфармацыю, каб ведаць, якое падраздзяленне высылаць і на якой тэхніцы. Зразумела, што калі палае прыватны дом, то няма сэнсу гнаць туды аўталесвіцу для вышынных будынкаў. Звычайна сеанс размовы доўжыцца ў раёне трыццаці секундаў. Але, канешне, гэта залежыць ад псіхалагічнага стану таго, хто да нас звяртаецца. Зразумела, што напалоханы чалавек затрабуе больш часу. Да таго ж не заўжды людзі называюць адрас разборліва. А, напрыклад, у Мінску ёсць вуліцы з сугучнымі назвамі. Напрыклад, вуліцы Якубава, Якубоўскага і Якуба Коласа знаходзяцца ў трох розных канцах гораду.

На сцэне ў нас вісіць падрабязная карта сталіцы, якая раздзелена на зоны адказнасці пажарных часцей. Так што дыспетчар мусіць ведаць і знаходжанне больш чым тысячы вуліц горада — як вялікіх, так і зусім дробных закавулачкаў, якія схаваліся ў нетрах прыватнага сектара, каб не марнаваць каштоўныя секунды на пошук патрэбнай назвы. Пасля мы па селектары звязваемся з неабходнай часцю і перадаём усю атрыманую інфармацыю.

**«Калі чалавек крыху выпіў, то гэта ж не азначае таго, што нічога не адбылося. Але ж нам часта «забіваюць» лінію лухтой накшталт «Вы абавязаны нас падвезці». Нібыта мы паслугі таксі аказваем. Ды яшчэ і абразіць могуць».**

***— Ці ёсць свае асаблівасці, калі вам тэлефануюць дзеці?***

— Дзеці часцяком размаўляюць больш упэўнена за дарослых. Магчыма, з-за таго, што ў іх не так моцна развіта пачуццё страху. Ды і цяпер у нас прапаганда добра скіравана на навучанне дзяцей як у садках, так і ў школах. Там нашы супрацоўнікі расказваюць, калі і чаму трэба тэлефанаваць па нумары 101. Разам з тым у дыспетчараў ёсць методыка, па якой можна распазнаць, праўду гаворыць малы альбо вырашыў пазабаўляцца.

***— Ці шмат выклікаў заведама ілжывых?***

— Не так даўно ў хвалю маразоў быў паказальны выпадак. Нам патэлефанавалі, паведамілі, што гарыць аўтамабіль. Прыехала на месца падраздзяленне, а машына як быццам бы і цэлая. Вось толькі знізу ідзе нейкі белы дымок. Пасля аказалася, што аўто было прыпаркавана акурат на люку цеплатрасы.

***— А як часта тэлефануюць наконт жывёл?***

— Часцей за ўсё нас просяць зняць ката з дрэва, такіх выклікаў бывае нават некалькі за суткі, прычым у любую пару года. І што яны там узімку робяць? Зноў жа, цікаўная жывёла захрасла недзе лапай. А бывае, нам паведамляюць і пра дзікіх жывёл у горадзе — скажам, кіроўца заўважыў лася на кальцавой дарозе. Напрыклад, такія выклікі мы пераадрасоўваем у леспаркгас і ДАІ. Выратаванне жывёл не ўваходзіць у абавязкі работнікаў МНС. Аднак калі дапамагчы ім без удзелу ратавальнікаў няма магчымасці, і ў гэты момант дапамога людзям не патрабуецца — мы стараемся адгукацца на такія выпадкі.

***— Як здымаеце стрэс? 24 гадзіны трэба быць гатовым да таго, што могуць патэлефанаваць...***

— Я стараюся блізка да сэрца не прымаць. Калі абірала прафесію, ведала, на што іду. Канешне, бывае, што перажываеш, але ў выхадны дзень стараешся проста не думаць пра тое, што адбываецца на працы.

***— Часта вам званяць людзі нападпітку?***

— Калі чалавек крыху выпіў, то гэта ж не азначае таго, што нічога не адбылося. Але ж нам часта «забіваюць» лінію лухтой накшталт «Вы абавязаны нас падвезці». Нібыта мы паслугі таксі аказваем. Ды яшчэ і абразіць могуць.

***— Як залежыць колькасць званкоў ад надвор'я?***

— Узімку ў маразы іх шмат, улетку — меней, асабліва на выхадных. Людзі выязджаюць за горад. Вось хутка пачнецца вясна, людзі стануць наводзіць парадак на прысядзібных участках — і да нас, як казалі калегі з досведам, будуць тэлефанаваць і скардзіцца на суседзяў, якія паляць смецце ў прыватным сектары.

***— Чалавек хоча стаць дыспетчарам. Які ён мусіць быць?***

— Неабходна звярнуцца ў раённы аддзел па надзвычайных сітуацыях. Яго накіруюць для праходжання ваенна-ўрачэбнай камісіі. Калі медыкі дадуць дабро, то будзе неабходна здаць нарматывы па фізічнай падрыхтоўцы: бег, падцягванні для хлопцаў, для дзяўчат — прэс. Пасля абавязковы візіт да псіхолага, які таксама вынесуць заключэнне аб вашай прыдатнасці да гэтай работы. І, канешне ж, трэба не мець выпадкаў канфлікту з законам.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Памяць пра Вялікую вайну

# ДЗЯДОЎ ШАНУЕМ, А ПРАДЗЕДАЎ ЗАБЫВАЕМСЯ

## Магілёўскія гісторыкі ўстанавілі імёны васьмі беларусаў — кавалераў поўнага Георгіеўскага банта

**Гісторыя захавала пра іх зусім мала інфармацыі. Скупыя архіўныя звесткі, у лепшым выпадку — дзе і калі нарадзіўся, нумары ўзнагарод, кароткае апісанне подзвігу. Але дасведчанаму чалавеку не трэба тлумачыць, што стаіць за гэтымі сціплымі радкамі. З 1913 года ў рускай арміі медаль «За адвагу» быў прылічаны да георгіеўскіх узнагарод і разам з чатырма Георгіеўскімі крыжамі складаў поўны Георгіеўскі бант. Узнагароды рабіліся з золата або серабра і вельмі высока цаніліся. Заслужыць поўны Георгіеўскі бант было надзвычай цяжка. Сёння на ўсю Беларусь пакуль налічваецца ўсяго восем такіх герояў — і гэта на 800 000 прызваных у 1914 годзе на вайну.**



Кавалер поўнага Георгіеўскага банта Фядот Купцоў аддаў свае ўзнагароды галадаючым Паволжжа.

### Знішчаная памяць

Сяргей БЯСПАНСКІ, намеснік старшыні магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «ВІККРУ», у пошукавай рабоце з 1994 года. Кажа, што цікавіцца лёсам герояў Першай сусветнай стаў на кантрасце з Другой сусветнай вайной.

— Атрымлівалася, што мы шмат чаго даведаліся пра Другую сусветную, а Першай — быццам бы зусім і не было, — кажа ён. — Людзі ваявалі, а мы пра іх забыліся. Дзядоў шануем, а пра прадзедаў нават і не ўспамінаем. Гэта несправядліва.

На жаль, жывыя сведкі таго перыяду ўжо даўно пайшлі з жыцця, асноўнымі крыніцамі сталі кніга «Памяць» Беларусі, архівы, музейныя работнікі, энтузіясты-даследчыкі з Беларусі, Расіі і Украіны. Што датычыцца музеяў, то інфармацыі там знайшлося не шмат — адзінкавыя звесткі, і то больш пра тых салдат, у каго было па 2-3 крыжы.

— У савецкі час спісы георгіеўскіх кавалераў практычна былі знішчаны, — кажа Сяргей Бяспанскі. — Увявіце сабе: у Расійскай імперыі было больш за дзве тысячы такіх спісаў. На сённяшні дзень у расійскіх архівах захавалася каля 80. Многія з гэтых людзей былі рэпрэсіраваныя, нехта адседзеў, кагосьці расстралялі. Калі паглядзець школьныя і інстытуцыя падручнікі гісторыі, пачынаючы з 1920-х гадоў, то ў іх гэтая вайна ахарактарызавана як «імперыялістычная», «несправядлівая» і «не патрэбная народу». Прычына відавочная: усё, што было да рэвалюцыі, абвяшчалася бацьцбой за лжывыя і варожыя працоўным інтарэсы. Але для пераемнасці пакаленняў сёння вельмі неабходна беражліва аднаўляць памяць пра тыя падзеі. Тым больш што Руская імператарская армія ваявала годна, праяўляючы сапраўдны масавы гераізм, ахвярнасць і мужнасць. І няма салдацкай віны ў тым, што галоўнакамандуючы ад іх адрокся ў сакавіку 1917...

### Справа энтузіястаў

У Беларусі няшмат гісторыкаў, якія сур'ёзна займаюцца Першай сусветнай. Ваенны пісьменнік, старшыня магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «ВІККРУ», Мікалай Барысенка, зрабіў добрую падборку па георгіеўскіх кавалерах Магілёўскай губерні. Некалькі гадоў таму выйшла яго кніга «Рэха вялікай вайны», дзе ён падаў імёны каля 30 поўных георгіеўскіх кавалераў. Сяргею Бяспанскаму пашчасціла знайсці імёны каля 350 ураджэнцаў Віцебскай, Віленскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай губерняў. З іх 152 — кавалеры поўнага Георгіеўскага крыжа. З іх толькі восем чалавек акрамя чатырох крыжоў мелі яшчэ і Георгіеўскія медалі «За храбрасць» і насілі званне кавалераў поўнага Георгіеўскага банта.

— Самай жаданай узнагародай рускага салдата на той вайне быў Георгіеўскі крыж, — кажа Сяргей. — Кавалеры поўнага Георгіеўскага банта самыя адважныя. У іх не чатыры ўзнагароды, а восем. Гэта значыць, што яны ў два разы болей глядзелі ў твар смерці. Каб іх знайсці, я чатыры гады сядзеў у архівах, вывучаў адпаведную літаратуру, спісваўся з расіянамі, украінцамі. Работа рупцінная, штабная. Калі нехта нешта знайшоў, радасць вялікая. Людзі працуюць бескарысліва, выдаюць кнігі за свае грошы. Нездарма такіх у жарт называюць «з кантузіяй у галаве».

Магілёўскія пошукавікі вельмі ўдзячныя расійскім архівістам Сяргею Патрыкееву і Юрыю Курэпіну. Тым, хто нават па мінімуме цікавіцца Першай сусветнай вайной, не трэба тлумачыць, хто гэта такія. Абодва складаюць зводны спіс георгіеўскіх кавалераў па ўсёй былой Расійскай імперыі. На ўзроўні Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі па Першай сусветнай вайне ствараецца нешта накшталт знаёмага ўсім партала АБД «Мемарыял».

— А ў нас нават дзяржпраграмы няма па Першай сусветнай, — уздыхае Сяргей. — Вайна пракацілася па ўсёй Беларусі, на працягу 1914—1918 гадоў сотні тысяч маладых беларусаў (па розных даных, ад 800 да 923 тысяч) сталі пад ружжо, 70 тысяч загінулі. Смаргонь, Паставы, Баранавічы — асноўныя цэнтры баявых дзеянняў, але хто з моладзі ведае пра гэта? У Смаргоні паспрабавалі паставіць зводны помнік, але задуманае так і не давялі да канца. І музея па Першай сусветнай вайне ў нас пакуль няма. Гэта ненармальна. Бо менавіта падчас той вайны выкрышталізавалася ідэя беларускай незалежнасці. Пасля ўсіх перажытых ваенных жахаў людзі зразумелі, што лепей жыць сваім домам.





Крыж на месцы былых баёў каля вёскі Выганашчы Івацэвіцкага раёна.

### Сапраўдныя абаронцы Айчыны

Несумненна, кавалераў поўнага Георгіеўскага банта сярод беларусаў было нашмат болей. І восем імён, вернутыя з небыцця, — толькі пачатак. Гэтыя героі — наш гонар, пацвярджэнне таго, што беларусы — мужная нацыя. Чацвёра з васьмі менавіта ўраджэнцы Магілёўскай губерні. Гэта Дзямід Іванавіч Панкратаў з вёскі Дубраўка Аршанскага ўезда, падпрапаршчык лейб-гвардыі 14-й роты Ізмайлаўскага палка; Рыгор Сямёнавіч Дэблікаў, ураджэнец сяла Завідаўка Гомельскага ўезда, старшы унтэр-афіцэр 4-й роты лейб-гвардыі 2-га стралковага Царскасельскага палка; Фядот Яўменавіч Купцоў з сяла Нікольскае Чавускага ўезда, старшы унтэр-афіцэр 8-й роты 1-га палка Яго Вялікасці Караля Чарнагорскага Мікалая (потым 397-га пяхотнага Запарожскага палка); Мікіта Адамавіч Ліпнякоў, 1873 года нараджэння, з вёскі Рабавічы Быхаўскага павета (цяпер Слаўгарадскі раён).

Сярод кавалераў поўнага Георгіеўскага банта старшы унтэр-афіцэр лейб-гвардыі Паўлаўскага палка з каманды конных разведчыкаў, добраахвотнік, віцяблянін Васіль Сіняўскі; падпрапаршчык Яе Вялікасці Гасударыні Імператрыцы Аляксандры Фёдараўны палка Георгій Максімавіч Асіненка, 1891 года нараджэння, з вёскі Цёплая Віленскай губерні; старшы унтэр-афіцэр лейб-гвардыі 3-га стралковага Яго Вялікасці палка Яго Вялікасці роты Іван Іванавіч Баравік з горада Слуцка Мінскай губерні; падпрапаршчык лейб-гвардыі 3-й роты 2-га стралковага Царкасельскага палка Павел Рыгоравіч Качаноўскі з сяла Шчыты Гродзенскай губерні.

Поўнымі кавалерамі Георгіеўскага банта яны станавіліся на працягу ўсяго аднаго-двух гадоў. Іх подзвігі — прыклад неверагоднай смеласці і адважнасці. Напрыклад, Фядот Купцоў, калі разам з 40 салдатамі трапіў у акружэнне, сваёй бясстрашнасцю падтрымліваў у таварышах баявы дух, што дало ім магчымасць пратрымацца да прыходу свайго палка і не здаць пазіцыі. Георгій Асіненка адзін са сваіх крыжоў атрымаў за подзвіг у снежні 1914 года, калі, рызыкуючы жыццём, пад моцным ружэйным і кулямётным агнём аднавіў тэлефонную сувязь з перадавой. Гэтыя людзі былі не толькі адчайнымі воінамі, але яшчэ і вялікімі патрыётамі. Той жа Фядот Купцоў у пачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя здаў свае ўзнагароды ў дапамогу галадаючым Паволжжа. Але гэта не выратавала яго ад рэпрэсій. Пасля Вялікай Айчыннай вайны ён быў асуджаны ваенным трыбуналам войскаў НКУС па Магілёўскай вобласці на 15 гадоў лагерных работ. Памёр у 1952-м у Кемераўскай вобласці. На шэсць гадоў лагераў быў асуджаны і Мікіта Ліпнякоў — уладальнік аж пяці Георгіеўскіх крыжоў і чатырох Георгіеўскіх медалёў «За храбрасць». Дадому ён ужо не вярнуўся.

— Зараз наша задача знайсці нашчадкаў гэтых патрыётаў, каб расказаць, якія геройскія былі ў іх родзе людзі, — кажа Сяргей Бяспанскі. — Гэты перакос у гісторыі трэба ліквідаваць, каб была справядлівасць. Першая сусветная вайна была не менш вялікая і цяжкая, чым другая. І не менш гераічная.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Фотавернісаж

# ГЛЯДЗЕЦЬ ВАЧЫМА, БАЧЫЦЬ СЭРЦАМ



На афішы гэтай фотавыстаўкі няма эпіграфа. Кожны глядач можа сам знайсці словы, каб перадаць змест маляўнічай калекцыі. Мне, напрыклад, прыгадаліся радкі Максіма Багдановіча, калі ён пісаў пра Беларусь, якую бачыць здалёку.

— Паглядзі, як усход разгараецца,
Скольki ў хмарках залётных агня!

«Бачу Беларусь такой» — назваў сваю выстаўку **аўтар пейзажных фотаздымкаў Уладзіслаў ЦЫДЗІК**. Проста і сцвярджальна. Абагульняючы і, у той жа час, дазваляючы гледачам угледзацца ў самыя маленькія дэталі бясконцага наваколля. Запрашаючы разам паглядзець на палаючыя ўсходы сонца, палёт бусла на золку, старыя храмы...

Для фотааматараў імя аўтара малавядомае. Але многія з нас прыгадаюць: у недалёкім мінулым ён працаваў на адказнай дзяржаўнай службе, быў дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Цяпер знаходзіцца на адпачынку. Але, як і заўжды, не ўяўляе свайго жыцця без карыснай для грамадства справы. Такая матывацыя і ў яго захаплення фатаздымкай роднай прыроды.

Мастацкі фотаальбом Уладзіслава Цыдзіка «Зачараваны Беларуссю», выдадзены Выдавецкім домам «Звязда», быў прэзентаваны ў час адкрыцця фотавыстаўкі, а сама калекцыя здымкаў стала прадметам абмеркавання сярод мастакоў, пісьменнікаў, прадстаўнікоў нацыянальных дыяспар, што пражываюць у Беларусі. Гэтаму спрыяла атмасфера памяшкання, дзе размясцілася экспазіцыя — мінскага касцёла Св. Сымона і Св. Алены.

На гэтай выстаўцы вы не ўбачыце фота з неверагоднымі ракурсамі, вас не ашаломіць здымак, які дэманструе магчымасці самай сучаснай оптыкі. Усё паказана вельмі дасціпна, быццам бы аўтар па-сяброўску запрашае прайсці побач з ім па росных паплавах, палюбавацца старым садам, убачыць у ранішнім тумане вазок на лясной дарозе... Аўтар нібыта кажа гледачу: заўважыў гэта я, але бачым і захапляемся мы з табой аднолькава...

Аднолькавасць светаўспрымання існуе там, дзе паміж людзьмі існуюць духоўнае адзінства, любоў да роднай зямлі.

**Яўген ПЯСЕЦКІ, фота аўтара**







## Управляющий объявляет о проведении последних торгов по продаже имущества ОАО «Ветковская хлопкопрядильная фабрика». Торги проводятся в форме открытого аукциона. Торги состоятся 14 марта 2018 года в 11.00 по адресу: Гомельская область г. Ветка, ул. Батракова, 38

| № Лота | Наименование объекта, краткая характеристика объекта (лота) | Начальная цена продажи, руб. (цена с учетом НДС) | Задаток, руб. | Шаг аукциона, % | Затраты на подготовку документации |
|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 106 | Единый объект недвижимого имущества (котельная инв. № 12) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-38293 площадью 276 м$^2$, расположенного по адресу: Гомельская область, Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38 на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000125 площадью 0,1554 га, котел универсальный – 6М инв. № 161; № 158; № 156; № 157 емкость 25 м/куб инв. № 29; № 30, дымосос ДН-6,3 лев 5,5/1500 инв. № 966, бордюр – 95 м, асфальтированная площадка – 286,6 м$^2$, кабельная сеть 0,4 кВт. инв. № 36, трубопровод заполнения резервуаров – 10,7 м, противопожарный водопровод 36,1 м, сети ливневой канализации 37,9 м, теплотрасса – 96,4 м, канализация – 47 м, хозпитьевой водопровод – 41 м, ограждение бетонное – 50,6 м | 28 778,36 | 287,78 | 5 | **1 676,00** |
| Лот № 107 | Единый объект недвижимого имущества (насосная станция инв. № 28) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-38624 площадью 48,9 м$^2$, расположенного по адресу: Гомельская область, Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/6; единый объект недвижимого имущества (здание бани инв. № 578) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-38623 площадью 57,1 м$^2$, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/5; единый объект недвижимого имущества в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-39094 площадью 0 м$^2$, наименование – пожарный резервуар 250 куб. м инв. № 578а, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38, все объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000121 площадью 0,2635 га, бордюр – 83,7 м, асфальтированная площадка – 361,1 м$^2$, кабельная сеть 0,4 кВт, инв. № 36, плитка цементно-песочная-27,6 м$^2$, трубопровод заполнения резервуаров – 185,3 м, противопожарный водопровод – 135,8 м, сети ливневой канализации – 68,1 м, теплотрасса – 126,4 м, канализация – 61,8 м, ограждение бетонное – 62 м | 30 620,07 | 306, 20 | 5 | **2 431,66** |
| Лот № 108 | Единый объект недвижимого имущества (здание насосной для подачи ГСМ инв. №16) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-39020 площадью – 19,1 м$^2$, расположенного по адресу: Гомельская область, Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38, корп. 4; единый объект недвижимого имущества (склад для хранения ГСМ инв. № 14) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-39021 площадью 20,6 м$^2$, расположенного по адресу: Гомельская область, Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, д. 38, корп. 3; единый объект недвижимого имущества (канализационная насосная станция инв. № 577) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-39097 площадью 0 м$^2$, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/9; единый объект недвижимого имущества (блок очистки дождевых вод инв. № 576,) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-39095 площадью 0 м$^2$, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38, все объекты расположены на участке с кадастровым номером 320850100004000122, площадью – 0,1579 га, асфальтированная площадка – 187,6 м$^2$; бордюр – 4 м; кабельная сеть – 0,4 кВт, инв. № 36, сети ливневой канализации – 39,8 м, сети хозбытовые напорные канализационные – 52,5 м, теплотрасса – 108,2 м, канализация – 31,2 м, ограждение бетонное – 43 м, ограждение кирпичное – 40,3 м | 14 470,82 | 144,71 | 5 | **2 226,06** |
| Лот № 109 | Единый объект недвижимого имущества (здание по ремонту деревянных конструкций, инв. № 1089) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-30614, площадью 125,5 м$^2$, расположенного по адресу: Гомельская область, Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38 на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000124, площадью – 0,1222 га, бордюр – 17,5 м, асфальтированная площадка – 322,1 м$^2$; кабельная сеть – 0,4, инв. № 36, противопожарный водопровод – 37,6 м, сети ливневой канализации – 52,5 м, канализация – 38,3 м, ограждение деревянное – 12,7 м | 9 812,77 | 98,13 | 5 | **1 323,66** |
| Лот № 110 | Единый объект недвижимого имущества(склад, инв. № 13,склад достройка № 13а, здание трансформаторной подстанции, инв. № 521, зарядное здание, инв. № 575) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-38292, площадью 749 м$^2$, расположенного по адресу: Гомельская область, Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38 на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000120 площадью – 0,1771 га, силовой трансформатор ТМ-1000, инв. № 39; № 40, высоковольтный щит КСО-366, инв. № 84, шкаф распределительный, инв. № 69; 98; 94; низковольтный щит, инв. № 85; конденсаторная установка VEB, инв. № 66; № б/н, конденсаторная установка УКБН-0,38-200, инв. № 83; № 82, конденсаторная установка Шальтанлагенбау Галле, инв. № 67, электрораспределительный пункт, инв. № 695; № 694; № 696, высоковольтная линия, инв. № 38, асфальтированная площадка – 633,1 м$^2$, кабельная сеть – 0,4 кВт, инв. № 36, противопожарный водопровод – 50,3 м, сети ливневой канализации – 68,9 м, канализация – 110,2 м, хозпитьевой водопровод – 62,6 м, ограждение бетонное – 44,6 м, ограждение кирпичное – 12,7 м | 54 344,92 | 543,45 | 5 | **1 844,27** |
| Лот № 111 | Единый объект недвижимого имущества (здание проходной, инв. №19) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-38289, площадью 28,1 м$^2$, расположенного по адресу: Гомельская область, Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/2 на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000118, площадью – 0,1854 га, автостоянка, инв. № 11, бордюр – 4 м, асфальтированная площадка – 260,8 м$^2$, кабельная сеть – 0,4 кВт, инв. № 36, хозпитьевой водопровод – 87 м, ограждение бетонное – 29,8 м, ограждение кирпичное – 6,3 м | 9 179,15 | 91,79 | 5 | **1 353,98** |
| Лот № 112 | Единый объект недвижимого имущества (механическая мастерская инв. № 7) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-3829 площадью 257 м$^2$, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38 на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000126 площадью – 0,0689 га, бордюр – 24,5 м, асфальтированная площадка – 98,0 м$^2$, кабельная сеть – 0,4 кВт, инв. № 36, противопожарный водопровод – 25,4 м, сети ливневой канализации – 25,3 м, канализация – 34,9 м, хозпитьевой водопровод – 63 м | 12 317,91 | 123,18 | 5 | **1 302,11** |
| Лот № 113 | Единый объект недвижимого имущества (здание гаража, инв. № 20; 20а; 20б) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-38625 площадью 211,4 м$^2$, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/8 на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000123, площадью – 0,1445 га, бордюр – 12,5 м, асфальтированная площадка – 729,8 м$^2$, кабельная сеть – 0,4 кВт, инв. № 36, противопожарный водопровод – 37,3 м, сети ливневой канализации – 38,8 м, теплотрасса – 124,2 м, канализация – 37,7 м, ограждение бетонное – 53,8 м | 19 101,50 | 191,02 | 5 | **1 502,03** |
| Лот № 114 | Единый объект недвижимого имущества (столовая инв. № 18; 18а) в составе капитального строения с инвентарным номером 311/С-28338 площадью 262,6 м$^2$, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/1, на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000119 площадью 0,1257 га, бордюр – 36,5 м, асфальтированная площадка – 388,9 м$^2$, кабельная сеть 0,4 кВт, инв. № 36, сети хозбытовые напорные канализационные – 105,2 м, теплотрасса – 35,4 м, канализация – 71 м, хозпитьевой водопровод – 36,4 м, ограждение бетонное – 26,2 м, ограждение кирпичное – 3,5 м, плитка цементно-песочная – 9,4 м$^2$ | 17 087,49 | 170,87 | 5 | **1 424,77** |
| Лот № 115 | Единый объект недвижимого имущества – изолированное помещение с инвентарным номером 311/С-8395 площадью 67,1 м$^2$, расположенное по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38-2, на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000117 площадью 0,0746 га, целевое назначение земельный участок для обслуживания административного здания, кабельная сеть 0,4 кВт, инв. № 36 | 15 955,79 | 159,56 | 5 | **637,86** |
| Лот № 116 | Единый объект недвижимого имущества – изолированное помещение с инвентарным номером 311/D-11683 общей площадью 217,4 м$^2$ на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000117 площадью – 0,0746 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания административного здания, по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38-1, плата KX-TE82461, инв. № 983, плата KX-TГ 824 80 X инв. № 975, шкаф распределительный ШР-МегаМ-24 УЗ, инв. № 2100, сервер, инв. № 64, базовый блок KX-TEM 824 RU, инв. №: 974, бордюр – 17,45 м, асфальтированная площадка – 116,2 м$^2$, кабельная сеть – 0,4 кВт, инв. № 36, сети хозбытовые напорные канализационные – 39,2 м, канализация – 13,4 м, ограждение кирпичное – 6 м, плитка бетонная – 8,5 м$^2$ | 23 504,80 | 235,05 | 5 | **1 104,85** |
| Лот № 118 | Единый объект недвижимого имущества – изолированное помещение с инвентарным номером 311/D-11698 общей площадью 5214,7 м$^2$ на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000008 площадью – 2,1263 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания производственного корпуса, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/7-3, вентиляционно-увлажнительная установка ВУУ-60, инв. № 701; № 700; № 699, воздухонагреватель ЗИГЗАГ, инв. № 874; № 873; № 872а; № 875, вращающийся распылитель воды ВРВ-100 инв. № 880; № 879; № 878; № 877, бордюр 183,5 м, асфальтированная площадка – 2760,9 м$^2$, кабельная сеть 0,4 кВт, инв. № 36, противопожарный водопровод – 67,5 м, теплотрасса – 55,6 м, канализация – 154,3 м, хозпитьевой водопровод – 243,7 м, ограждение бетонное – 22 м, ограждение деревянное – 6,6 м, ограждение кирпичное – 42,7 м, плитка цементно-песочная – 6 м$^2$ | 209 958,08 | 2 099,58 | 5 | **2 260,31** |
| Лот № 119 | Единый объект недвижимого имущества – изолированное помещение с инвентарным номером 311/D-88 общей площадью 1026,6 м$^2$ на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000008 площадью – 2,1263 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания зданияпроизводственного корпуса, расположенного по адресу: Гомельская обл. Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38, бордюр – 38,9 м, асфальтированная площадка – 310,6 м$^2$, кабельная сеть – 0,4 кВт, инв. № 36, канализация – 60 м, хозпитьевой водопровод – 49,9 м | 44 713,70 | 447,14 | 5 | **595,90** |
| Лот № 120 | Единый объект недвижимого имущества – изолированное помещение с инвентарным номером 311/D-11695 общей площадью 6822,1 м$^2$ на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000008 площадью 2,1263 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания производственного корпуса, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/7-1, лифт грузовой ПГ-297, инв. № 854; № 853, преобразовательная установка «Уза», инв. № 706, кабельная сеть – 0,4 кВт, инв. № 36, асфальтированная площадка – 112,3 м$^2$, канализация – 61,7 м, хозпитьевой водопровод – 223,1 м, ограждение бетонное – 92,8 м | 225 814,27 | 2 258,14 | 5 | **1 803,55** |
| Лот № 121 | Единый объект недвижимого имущества – изолированное помещение с инвентарным номером 311/D-11696 общей площадью 404,2 м$^2$, на земельном участке с кадастровым номером 320850100004000008, площадью 2,1263 га, целевое назначение – земельный участок для обслуживания здания производственного корпуса, расположенного по адресу: Гомельская обл., Ветковский р-н, г. Ветка, ул. Батракова, 38/7-1а, кабельная сеть – 0,4 кВт, инв. № 36, ограждение бетонное – 34,1 м | 18 971,26 | 189,71 | 5 | **1 497,06** |
| Лот № 67 | Установка компрессорная ВК20Е-8-500Д, инв. № 985 | 4 248,00 | 424,80 | 5 | **90,63** |
| Лот № 71 | Компрессор Atlas Copso AIRGA 18P. инв. № 8 | 4 387,20 | 438,72 | 5 | **72,43** |
| Лот № 83 | ПрессАРО-1, инв. № 753 | 2 088,00 | 208,80 | 5 | **90,63** |
| Лот № 85 | Смеситель для угаров СН-3-У, инв. № 750 | 2 088,00 | 208,80 | 5 | **90,63** |
| Лот № 90 | Гидравлический литьевой пресс, инв. № 922 | 1 584,00 | 158,40 | 5 | **90,63** |
| Лот № 91 | Грузонесущий цепной конвейер ЦПК-80Р, инв. № 840 | 4 104,00 | 410,40 | 5 | **90,63** |
| Лот № 95 | Шлифовальная машина, инв. № 54 | 22 752,00 | 2 275,20 | 5 | **90,63** |
| Лот № 96 | Телевизионная система видеонаблюдения, инв. № 88 | 18 216,00 | 1 821,60 | 5 | **90,63** |
| Лот № 98 | Мотальная машина МТ-2, инв. № 87 | 2 412,00 | 214,20 | 5 | **90,62** |
| Лот № 99 | Мотальная машина МТ-2, инв. № 86 | 1 886,00 | 188,60 | 5 | **90,62** |
| Лот № 102 | Электропогрузчик ЕВ-687-33-10 (2-й этаж), инв. № 312 | 936,00 | 93,60 | 5 | **90,62** |
| Лот № 105 | «Форд Транзит», инв. № 000125 | 9 600,00 | 960,00 | 5 | **313,05** |
| Лот № 122 | Тепловая пушка ЭК 36П, инв. № 1204 | 261,00 | 26,10 | 5 | **134,02** |
| Лот № 123 | Тепловая пушка ЭК 36П, инв. № 1205 | 261,00 | 26,10 | 5 | **134,02** |
| Лот № 124 | Агрегатэлектронасосный К80-65-160 | 324,00 | 32,40 | 5 | **134,02** |
| Лот № 125 | Станок механический ножовочный, инв. № 338 | 621,00 | 62,10 | 5 | **134,02** |
| Лот № 127 | Кран-балка ручная подвесная, инв. № 707 | 570,24 | 57,02 | 5 | **107,62** |
| Лот № 128 | FIBROTEST электрический, инв. № 2020 | 82 435,32 | 8 243,53 | 5 | **107,64** |
| Лот № 129 | Измерительный прибор для верхних валиков, инв. № 52 | 9 904,68 | 990,47 | 5 | **107,62** |
| Лот № 130 | Регулятор воздуха, инв. № 5404 | 12,96 | 1,30 | 5 | **107,62** |
| Лот № 131 | Регулятор воздуха, инв. № 5405 | 12,96 | 1,30 | 5 | **107,62** |
| Лот № 132 | Установка компрессорная, инв. №4052 | 11 402,64 | 1 140,26 | 5 | **107,63** |
| Лот № 133 | Микроскоп биологический МБА ТУ РБ, инв. № 89 | 961,20 | 96,12 | 5 | **107,62** |
| Лот № 134 | Ручной прибор для определения содерж. влаги, инв. № 2022 | 556,20 | 55,62 | 5 | **107,62** |
| Лот № 135 | Тахометр часовой ТЧ10-Р, инв. № 90 | 312,00 | 31,20 | 5 | **107,62** |
| Лот № 136 | Горизонтально-фрезерный станок, инв. № 883 | 345,60 | 34,56 | 5 | **107,62** |
| Лот № 137 | Весы ВАР-200, инв. № 895 Б | 415,80 | 41,58 | 5 | **107,62** |
| | Дебиторская задолженность | 767 357,09 | 76 735,71 | 5 | **182,00** |

Имущество расположено по адресу: Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38.

Заявления на участие в торгах принимаются **по 13 марта 2018 года** до 15.00 по адресу: Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38.

Со всей информацией по проведению аукциона можно ознакомиться на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве: **https://bankrot.gov.by/ManagerSection/ManagerMessages.aspx**

С дополнительной информацией о торгах можно ознакомиться по адресу: Гомельская область, г. Ветка, ул. Батракова, 38, тел.: 8 (02330) 2-11-06, 2-12-03. Выходные дни: суббота, воскресенье

■ Пошта

# «ДНЯ РОДНАЙ МОВЫ МАЛА...»

**...У іншых людзей зазвычай цікавяцца, як прайшоў іх дзень, што новага на працы? У мяне, ведаючы яе спецыфіку, пытаюць: «Што людзі пішуць?» Бо многім гэта і сапраўды цікава.**

*У нашай сталічнай гімназіі № 174 Маскоўскага раёна сёлета ўпершыню адбыўся раённы конкурс чытальнікаў «Сэрцам роднага слова кранія», —* паведамляе **настаўніца беларускай мовы і літаратуры спадарыня Ганна Казлова.** — *Да гэтага свята, да дня роднай мовы, былі запланаваны інфармацыйныя гадзіны, акцыя «Гавары са мной па-беларуску», кніжныя выставы, конкурсы малюнкаў. Але ж, самым маштабным стаў конкурс чытальнікаў, які сабраў вучняў амаль усіх навучальных устаноў раёна. Ён праходзіў тры дні і ўсе тры — наша гімназія прымала гасцей: канкурсантаў, іх бацькоў, настаўнікаў...*

*Тэматыка вершаў, што абралі для сябе ўдзельнікі, была самая разнастайная: чыталіся творы як класікаў — Якуба Коласа, Максіма Багдановіча, Петруся Броўкі, Максіма Танка, Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча, так і маладых паэтаў, у тым ліку — з намінацыі «Уласныя вершы».*

*Пра што яны? Пра сваю Радзіму, родны горад, бацькоў, сяброўства, мір і вайну — пра ўсё, што хвалюе. Журы найбольш уразілі вершы Арцёма Кржэмінскага, Паліны Літоўчанкі, Аляксандра Палоніка, Іны Фрамянковай.*

*Некаторыя ўдзельнікі выступалі з музычным суправаджэннем, з інсцэніроўкамі твораў. І кожнага ўдзельніка гледачы падтрымлівалі апладысментамі.*

*Журы між тым вызначала пераможцаў ва ўсіх узроставых групах. Імі сталі Кіра Граздова (СШ № 67), Іван Цітоў (СШ № 101), Аліса Курс (СШ № 9), Кацярына Маісеева і Фрося Наздрына (цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Ранак»), Ліна Тонкевіч (гімназія № 61), Марына Ракоўская (СШ № 161), Міхаіл Наскоў (СШ № 154), Дар'я Сінюк (СШ № 208) і Марыя Харольская (гімназія № 10). У ліку пераможцаў і трое вучняў нашай — Меланне Насякайла, Ганна Сабайдакова і Арына Хадкевіч.*

*Сам жа конкурс чытальнікаў, —* як прызнаецца Ганна Казлова, — *пакінуў шмат цудоўных уражанняў. І самае, бадай, галоўнае — што адбылася такая сустрэча, такое вось свята роднай мовы.*



*Што яна для чалавека? На гэтае пытанне кожны, відаць, адкажа па-свойму. Для вучняў, якія бралі ўдзел у конкурсе, мова — гэта вялікі скарб, з дапамогай якога яны выказвалі свае думкі, пачуцці, уражанні, частка гістарычнай спадчыны і чалавечай культуры.*

*Хочацца спадзявацца, —* напрыканцы ліста піша Ганна Васілеўна, — *што такія мерапрыемствы ў нашым раёне стануць добрай традыцыяй...*

Бо патрэба ў гэтым ёсць, прычым відавочная.

*«Паводле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, у нас дзве дзяржаўныя мовы, —* нагадвае **спадар Уладзімір Глеб з Віцебска.** — *Аднак апошнім часам усё часцей складваецца ўражанне, што яна адна — руская, а вось беларуская пры ўсёй нашай незалежнасці паступова ператвараецца ў замежную, выступае ў ролі папялушкі. Нельга мірыцца з тым, што не ў кожным абласным цэнтры ёсць беларускамоўныя школы, не кажучы ўжо пра так званыя гарады абласнога падпарадкавання, пра раённыя цэнтры. І нельга не захапляцца гераізмам мінчан, якія, гадуючы малых сапраўднымі беларусамі, вымушаны вазіць іх у беларускамоўныя групы садкоў ледзь не праз увесь горад. Ствараючы такія «камфортныя ўмовы» для мовы, мы не паважаем сябе...»*

Дык ці трэба дзівіцца і абурацца, што нашы суседзі, у тым ліку пісьменныя, супрацоўнікі радыё і тэлебачання, дагэтуль не запомнілі назву нашай краіны, дагэтуль завуць Беларусь Беларуссіяй?

Гэтае пытанне ўжо з іншага ліста — ад **спадара Казлоўскага з Рагачова.** *«Я не заклікаю будаваць агароджы, але ж калі мы самі не будзем паважаць сваю мову, ведаць сваю гісторыю, шанаваць культуру, то не трэба гэтага чакаць ад суседзяў».*

З таго ж канверта і, як той казаў, «карціна алеем»: на прызыўным пункце сядзяць два хлопцы з суседніх вёсак, размаўляюць пра свае хатнія справы, ужываюць слова «певень». «А што гэта такое?» — пытае трэці, які ў гэты час праходзіць міма. — Вяскоўцы тлумачаць, гараджанін рагоча... *«Такі вось чынам, —* робіць выснову чытач, — *мы дарагаталіся да таго, што цяпер і ў вёсках многія не ведаюць роднай мовы...»*

Для таго, каб такога не назіралася, працуе цэлае войска педагогаў, якія вучаць мове і на ўроках, і пасля... *«Не так даўно ў нас прайшоў тыдзень беларускай мовы, —* паведамляе **настаўніца Мушынскага дзіцячага садка-сярэдняй школы, што на Мсціслаўшчыне, спадарыня Лілія Мацвеенка.** — *Самым яркім і відовішчным сярод яго мерапрыемстваў атрымаўся конкурс інсцэніровак па творах беларускіх пісьменнікаў Якуба Коласа, Янкі Купалы, Кузьмы Чорнага, Алены Васілевіч, Змітрака Бядулі, самай шырокамаштабнай — інтэлектуальна-пазнавальная гульня «Мой родны кут», мэтай якой было пашырыць веды пра Беларусь, яе мову і славутых землякоў... На высокай патрыятычнай ноце прайшла і акцыя «Жыві, мова!». Вучні Стас Лаўроў, Ягор Сцяпанаў, Святлана Шэлест і Алеся Шэндрыкава перамаглі ў конкурсе чытальнікаў вершаў.*

Настаўніца, на жаль, не паведамляе, якія, канкрэтна, паэтычныя творы прагучалі падчас гэтага конкурсу. Але ж цалкам магчыма, што было там і знакамітае:

*«Кажуць, мова мая аджывае*
*Век свой ціхі: ёй знікнуць пара.*
*Для мяне ж яна вечна жывая,*
*Як раса, як сляза, як зара...*

Прыгожы, пранікнёны верш Пімена Панчанкі!.. Які — хоць і грэх прызнавацца — усё дарослае жыццё здаваўся мне... трохі недапісаным: бянтэжылі, у прыватнасці, не такія моцныя (у параўнанні з першымі) заключныя радкі:

*Ці плачу я, ці пяю,*
*Ці размаўляю з матуляю —*
*Мову сваю, песню сваю*
*Я да грудзей прытульваю.*

Толькі нядаўна даведалася, што паэт напісаў іх пад ціскам цэнзуры, а першапачатковая канцоўка верша гучала зусім па-іншаму

*Ці плачу я, ці пяю?..*
*Восень. На вуліцы цёмна...*
*Пакіньце мне мову маю,*
*Пакіньце жыццё мне!*

Як той казаў, адчуйце розніцу і згадзіцеся: паэзія, проза (не толькі Панчанкі — усіх нашых творцаў), як і сама нацыя, будуць жыць толькі тады, калі будзе жыць мова.

Трэба сказаць, што дзень яе — родны — асобных з нашых чытачоў заспеў, што называецца, знянацку. *«Не буду казаць пра іншых пенсіянераў, —* прызнаўся **спадар Уладзімір Пішчулін з Мінска,** — *але ў мяне жыццё досыць аднастайнае, усе дні падобныя, што 5 лютага, што 20, што аўторак, што серада, распарадак адзін: тэлевізар, снеданне, свежы нумар «Звязды», а там, глядзіш, і абед.*



*Іншы сцэнарый хіба ў выхадныя ды святы, калі на працу не сыходзіць дачка.*

*Я гэта да таго, што надоечы зранку ўключыў тэлевізар і... нічога не зразумеў: беларускія навіны перадавалі па-беларуску, рэпартажы з Алімпіяды — таксама. Ад чаго ў галаве — лёгкая паніка і цэлы рой дум! Найперш успомніліся часы, калі тэлебачаннем кіраваў — светлай памяці — Генадзь Бураўкін, потым з'явілася надзея, што зараз акурат таксама будзе кіраваць нядаўна прызначаны спадар Іван Эйсмант...*

*У любым выпадку, —* як паведамляў спадар Пішчулін, — *я быў шчаслівы! Я адчуваў сябе сваім у сваёй краіне і шчыра здзіўляўся: аказваецца і больш сталыя зоркі нашага тэлебачання, і маладыя хлопцы і дзяўчаты, якія заўсёды так ліха «шчабечуць» на другой дзяржаўнай мове, добра валодаюць першай... Дык чаму ж тады?..*

*Шмат аб чым хацелася паразважаць, але пошта прынесла свежы нумар «Звязды», —* распавядаў чытач. — *Разгарнуў яго і ўсё зразумеў: 21 лютага — сусветны дзень роднай мовы... Месцу яе, стану яе ў Беларусі прысвечаны цэлы разварот — «Круглы стол». Прачытаў яго з вялікай цікавасцю і нават з аптымізмам. А потым зноў вярнуўся да тэлевізара. Шчыра скажу, што даўно ўжо не атрымліваў такога задавальнення ад прагляду праграм».*

*«З пэўнымі надзеямі, —* як паведамляе спадар Уладзімір, — *уключыў яго і назаўтра. Чакаў, што, можа, цуд паўторыцца. На жаль, не — свята скончылася, і ўсё вярнулася на кругі свае».*

А чаму? — пытаецца чытач. І выступае з канкрэтнай прапановай: калі мы гаворым пра ціхую беларусізацыю, то, магчыма, ёсць сэнс вось такія дні роднай мовы ладзіць не адзін раз на год, а хоць бы на тыдзень, на месяц... Бо беларуская мова ў Беларусі, у яе сталіцы і сапраўды павінна гучаць не толькі на ўроках ды ў грамадскім транспарце.

*«І дзякуй богу яшчэ, што жыве беларускамоўная «Звязда»!»*

*«Заўжды выпісваю, чакаю і чытаю...»*

*«Немагчыма пераацаніць тую ролю, якую выконвае газета ў справе абароны мовы тытульнай нацыі».*

Гэта — радкі з іншых лістоў. Значыць, ёсць сэнс працаваць далей.

**Пошту чытала**
**Валянціна ДОЎНАР**

■

■ Чалавек — чалавеку

## БУСЛІНАЯ ЎДЗЯЧНАСЦЬ

**Хата ў вёсцы засталася гэтым братам у спадчыну — ад бабулі з дзядулем.**

Новыя гаспадары любяць туды прыязджаць. Вось і ў той раз завіталі на выхадныя, вечарам памыліся ў лазні, прыгатавалі шашлыкі, выпілі па чарачцы. Набліжалася ноч, і да слыху адпачывальнікаў данёсся нейкі шоргат. Насцярожыліся: што гэта можа быць? Абышлі вакол пабудоў — нічога падазронага. Так і паснулі...

Нараніцу той жа, нават гучнейшы шоргат паўтарыўся, і браты рушылі да суседняй хаты, што даўно ўжо пуставала. Там, паміж сцяной пахіленай паветкі ды кучай дроў, і ўбачылі маладзенькага бусла. Ён нейкім чынам трапіў туды, а вось выбрацца ніяк не мог.

Браты засталі гэтага небараку, пасадзілі ля сажалкі, пачаставалі яшчэ хлебам і прывезеным мясам...

Праз некалькі гадзін дачнікі сабраліся ад'язджаць і ўбачылі, што двое дарослых буслоў і той «падлетак» сядзяць на страсе іх хаціны і дзюбамі выстукваюць «азбуку Морзэ». Трэба разумець, дзякуюць за выратаванне.

...Што цікава, гэтая карціна паўтаралася праз усё лета: як толькі ў двор заязджала машына, буслінае сямейства, заняўшы месца на даху, вітала гасцей.

**Фаіна КАСАТКІНА,**
*г. Паставы*

■

■ Добрая навіна

## ЛІЗАВЕТА — ЯНА Ж АЛЬЖБЭТА, А ФАМА — ТАМАШ...

**Што азначае ваша імя? Адказ на гэтае пытанне можна знайсці ў новым «Слоўніку асабовых уласных імён» аўтараў Уладзіміра Завальнюка і Валянціны Раманцэвіч пад агульнай рэдакцыяй акадэміка НАН Беларусі, доктара філалагічных навук Аляксандра Лукашанца.**

Кніга складаецца з трох частак: «Беларуска-рускі слоўнік імён (мужчынскія; жаночыя), «Каляндар імён», «Паходжанне і значэнне ўласных асабовых імён» (мужчынскія; жаночыя).

У канцы змешчаны дадатак, дзе падаюцца ў табліцах узоры скланення імён, імён па бацьку і некаторых прозвішчаў на рускай і беларускай мовах.

Мэта слоўніка, як сказана ў прадмове, «забяспечыць патрэбы сучаснай беларускай іменаслоўнай практыкі, аказаць дапамогу бацькам пры выбары для дзяцей імён у адпаведнасці з нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы, а таксама хрысціянскай (праваслаўнай, каталіцкай) традыцыі, упарадкаваць выкарыстанне ў афіцыйных дакументах імён, якія даюцца пры хрышчэнні».

Выпуск падрыхтаваны ў выдавецтве «Народная асвета» па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Кацярына ІВАНОВА,**
*г. Мінск*

■

## Цёплае адзенне і ніякага алкаголю

### Як засцерагчыся ад абмаражэння і пераахаладжэння

**Зіма не здае сваіх пазіцый, а ў апошнія дні лютага захоўваецца вельмі халоднае надвор'е. Як засцерагчыся ў маразы ад непрыемнасцяў на вуліцы, расказала валеолаг 2-й цэнтральнай раённай паліклінікі г. Мінска Людміла БАРТАШЭВІЧ.**

Абмаражэнне — гэта пашкоджанне тканак, выклікане ўздзеяннем нізкіх тэмператур. А пераахаладжэнне — моцнае ахаладжэнне арганізма, якое можа прывадзіць да розных захворванняў і нават смерці.

Аказанне першай дапамогі падчас абмаражэння першай ступені зводзіцца да аднаўлення кровазвароту ў пашкоджаных тканках паступовым саграваннем — з дапамогай цёплага адзення і знаходжання ў цёплым памяшканні. А вось саграваць канечнасці цёплай вадой ці расціраць іх снегам недапушчальна. Адпраўляць замерзлага чалавека ў гарачую ванну, яму можна толькі нашкодзіць, бо ад такога перападу тэмператур будуць пакутаваць крывяносныя сасуды. З той жа прычыны супрацьпаказаны расціранні і гарачая гарбата. Пітво павінна быць цёплае, але не гарачае.

Калі абмаражэнні больш глыбокія, пашкоджаныя ўчасткі цела неабходна ўхутаць сухім і цёплым адзеннем і даставіць пацярпелага ў медыцынскую ўстанову. А калі ўбачылі ў зімовы час на вуліцы ляжачага чалавека, яго неабходна неадкладна даставіць у цёплае памяшканне, інакш ён можа застацца без рук і ног, а то і ўвогуле замерзнуць.

У такое надвор'е трэба надзяваць цёплае, не цеснае адзенне і абуваць правільна падабраны ўцеплены абутак на тоўстай падэшве. Ён павінен быць сухі, не цесны, пажадана, не пранікальны для вады. Улічваючы той факт, што на пачатковых стадыях абмаражэння боль можа адсутнічаць, неабходна перыядычна абмацваць нос, вушы, пальцы рук. Адкрытыя ўчасткі цела перад выхадам на вуліцу пажадана змазаць тлустым крэмам. Дыхаць трэба праз нос. Гэта папярэджвае не толькі абмаражэнне носа, але і пераахаладжэнне верхніх і ніжніх дыхальных шляхоў. Тым, хто перанёс абмаражэнне, трэба памятаць, што пашкоджаныя раней участкі цела асабліва адчувальныя да холаду, таму іх трэба вельмі пільна аберагаць.

Не ўжывайце алкаголь. На марозе арганізм захоўвае цяпло, звужаючы перыферычныя сасуды, — гэта забяспечвае прыток крыві да ўнутраных органаў і стварае засцярогу ад агульнага пераахаладжэння. А алкаголь расшырае сасуды, зводзячы на нішто ўласную абарону арганізма. Акрамя таго, ён зніжае і адчувальнасць — вы занадта позна зразумееце, што замерзлі, і можаце не паспець прыняць неабходныя меры. Непажадана і курыць. Цыгарэты выклікаюць спазм перыферычных сасудаў, што пагаршае мікрацыркуляцыю крыві — такім чынам рызыка атрымаць абмаражэнне павялічваецца.

■ Гэта трэба ведаць

# Няправільная ежа, вірусы і стрэс правакуюць рак

**Аб тым, якія прадукты могуць выклікаць рак і як яго правакуе стрэс, а таксама пра тое, як змяніць свой лад жыцця, каб пазбегнуць анкалагічных хвароб, расказвае намеснік дырэктара па навуковай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Александрава, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар медыцынскіх навук, прафесар Сяргей КРАСНЫ.**

***— Ці ёсць прадукты, якія спрыяюць развіццю злаякасных новаўтварэнняў? Салодкая ежа сілкуе ракавую пухліну?***

— Сапраўды, некаторыя прадукты стымулююць узнікненне ракавай пухліны, іншыя — нейтральныя, трэція аказваюць прафілактычнае ўздзеянне і дапамагаюць у лячэнні. Садзейнічаюць узнікненню пухлін найперш прадукты з чырвонага мяса, асабліва смажаныя, і асабліва на няправільным алеі. Прафілактычныя ўласцівасці мае ежа, якая ўтрымлівае шмат амега-3 поліненасычаных тлустых кіслот. Ёсць два віды тлустых кіслот. Амега-6 шкодныя, яны стымулююць узнікненне пухлін, запаленняў, сардэчнасасудзістых хвароб, а амега-3 карысныя і аказваюць прафілактычнае ўздзеянне. Адпаведна, чым больш мы ўжываем амега-3 і менш амега-6, тым лепш. Амега-6 найперш утрымліваецца ў чырвоным мясе, амега-3 — у садавіне і агародніне, у некаторых відах алею, у марскіх прадуктах, у прыватнасці, рыбе. Якія віды алею карысныя? Такімі ў прафілактыцы ракавых пухлін уласцівасцямі валодае тры віды: аліўкавы, льняны і рапсавы. Заменікаў сланечнікавы на адзін з названых ніякіх праблем сёння не складае, яны ёсць у крамах, рапсавы і льняны алеі для нашай тэрыторыі характэрныя. Ёсць і асаблівыя прадукты, якія валодаюць супрацьпухлінным уздзеяннем, паколькі ўтрымліваюць асаблівыя рэчывы. Напрыклад, зялёная гарбата. У ёй, акрамя антыаксідантнага комплексу, які дапамагае ў прафілактыцы раку, ёсць антыангіягенныя рэчывы, якія перашкаджаюць узнікненню пухлінных сасудаў.



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Калі дастаткова шмат ужываць зялёнага чаю, 3—4 кубкі штодзень, як гэта робяць у Кітаі, тады з'явіцца такі станоўчы эфект. Таму парэкамендую зменшыць у рацыёне колькасць чырвонага мяса — ялавічыны, свініны і бараніны, а павялічыць ужыванне марскіх прадуктаў, рыбы. Шмат ёсць садавіны і гародніны ў тым ліку і для таго, каб добра працаваў кішэчнік. Не ўключаючы сюды, праўда, бульбу, якая карысных рэчываў, пра якія вядзём размову, не ўтрымлівае. Таксама важна зменшыць, але не цалкам ліквідаваць, ужыванне цукру. Пухліна ў першую чаргу сілкуецца тым, што найлепш засвойваецца — глюкозай. Таму калі злаякаснае новаўтварэнне ўзнікла, мы падмацоўваем яго салодкім. Замяніць алей, піць зялёны чай. Адмовіцца ад фастфуду, бо падчас яго прыгатавання пры кіпенні алею ўтвараецца шмат канцэрагенаў. І самае галоўнае — не пераядаць, бо лішняя вага таксама садзейнічае ўзнікненню злаякасных новаўтварэнняў.

***— Якія яшчэ фактары, акрамя няправільнага харчавання, садзейнічаюць узнікненню рака?***

— Адна з прычын — вірусы. Для нас гэта не настолькі характэрна, а вось у цёплых краінах вялікую частку складаюць пацыенты з ракам печані. Гэту пухліну выклікае пераважна вірус гепатыту С. Цяпер створаны вакцыны, усе прышчэпліваюцца супраць гепатыту B, і пакрыху пачынаюць вакцынавацца супраць гепатыту С, але пакуль не масава, бо ў нас гэта не распаўсюджанае захворванне.

Вірус папіломы чалавека можа выклікаць рак шыйкі маткі. І гэта, бадай, адзіная яго прычына. Трэба адзначыць, што пасля першага інфіцыравання вірусам адбываецца самавыздараўленне амаль заўсёды, калі няма сур'ёзных парушэнняў імунітэту. Пасля наступае рэінфіцыраванне — першае, другое і г. д. З-за іх і ўзнікае пасля пухліна шыйкі маткі. Таксама існуе вакцына супраць гэтага віруса. Прышчэплівацца дзяўчатам пажадана да пачатку палавога жыцця, праўда, цяпер і хлопчыкам робяць такія прышчэпкі. Калі паспець да сустрэчы з гэтым вірусам, які перадаецца палавым шляхам, рызыка інфіцыравання цалкам ліквідуецца. Калі прышчапіцца пасля? Пакуль няма доказаных вынікаў даследаванняў, але вядома, што таксама зніжаецца рызыка развіцця ракавай пухліны. Прычым гэта датычыць не толькі раку шыйкі маткі, але і, вельмі, дарэчы, злаякаснага раку поласці рота. У працаздольным узросце больш за 10 % смерцяў ад анкалогіі абумоўлена менавіта ім. Здавалася б, пухліна вонкавай лакалізацыі, яе лёгка выявіць, але мы маем шмат смерцяў, бо гэта дастаткова агрэсіўны рак. І выклікаецца ён часта вірусам папіломы чалавека. Таму прышчэпкі я б рэкамендаваў рабіць. Яны ўключаны ў каляндар прышчэпак, праўда, пакуль не бясплатныя, але робяцца ў многіх медыцынскіх установах.

**Пухлінныя клеткі ў нас утвараюцца пастаянна, але тут жа знішчаюцца імуннай сістэмай. Калі імунітэт слабы, то з гэтай задачай ён не спраўляецца.**

Бактэрыя хелікабактар пілары выклікае рак страўніка. У апошнія гады мы адзначаем рэзкае зніжэнне раку гэтай лакалізацыі, бо пачалі сур'ёзна ставіцца да дыягностыкі хелікабактар і лячэння такіх пацыентаў. Падчас гастраскапіі выконваецца біяпсія, пры выяўленні хелікабактар тэрапеўты праводзяць лячэнне і тым самым прафілактыку раку страўніка. Цяпер ёсць і іншы метад выяўлення — па аналізе крыві, пасля чаго робяць гастраскапію. У нас, дарэчы, у найбліжэйшы час плануецца навуковае даследаванне па стварэнні скрынінгавай праграмы па выяўленні раку страўніка ў групах рызыкі.

Яшчэ адзін фактар, які ўплывае на ўзнікненне раку — стрэсавыя сітуацыі. Яны сур'ёзна ўплываюць на наша жыццё. Прычым не толькі адмоўныя, але і станоўчыя. Шмат стрэсавых сітуацый, якія здараюцца адна за другой, могуць прыводзіць да зніжэння імунітэту. Смерць блізкіх, вяселле, скасаванне шлюбу, нараджэнне дзіцяці, набыццё кватэры, аўтамабіля — усё гэта для нас стрэсавыя сітуацыі. Калі стрэсу шмат, і чалавек яго не знімае, не пераключаецца на іншыя віды дзейнасці, то перанапружваецца і пакутуе імунная сістэма. І гэта вядзе да раку. Вядома, што пухлінныя клеткі ў нас утвараюцца пастаянна, але тут жа знішчаюцца імуннай сістэмай. Калі імунітэт слабы, то з гэтай задачай ён не спраўляецца. Таму можна рэкамендаваць пасля стрэсавых сітуацый пераключацца на іншую дзейнасць. Наведаць басейн, пачытаць кнігу, пагуляць па лесе... Падыходзіць класічная музыка ці тэатр, кантактаванне з малымі дзецьмі, з хатнімі жывёламі — у кожнага свой рэцэпт.

***— Як у найбліжэйшы час у Беларусі будзе развівацца дыягностыка раку?***

— Мы атрымалі проста ўнікальныя магчымасці для дыягностыкі анкалагічных хвароб. Адбылося поўнае пераўзбраенне — дзякуючы дзяржаўнай праграме, якая завяршылася ў 2014 годзе. Анкалагічныя ўстановы краіны набылі новае сучаснае абсталяванне, якое адпавядае міжнароднаму ўзроўню. З 2016 года мэтанакіравана ўкараняюцца скрынінгавыя праграмы. Яны не патрабуюць унікальнага суперсучаснага абсталявання, але неабходна сур'ёзная арганізацыя работы, сродкі на рэактывы і падрыхтоўку спецыялістаў. За год-два гэтага не зрабіць, вопыт іншых краін паказвае, што для ўкаранення скрынінгу на ўсёй тэрыторыі краіны патрабуецца ад 10 да 20 гадоў. Таму ў найбліжэйшы час мы будзем развівацца ў гэтым кірунку, скіраваным на раннюю дыягностыку і ахоп як мага большай колькасці насельніцтва. Калі ўдасца выяўляць рак пераважна на 1-2 стадыях, гэта будзе значны крок да перамогі, бо на ранніх этапах хваробы выздараўлівае ад 90 да 100 % пацыентаў ■

■ Пытанне-адказ

# НА БАЛЬНІЧНЫ БЕЗ ТЭМПЕРАТУРЫ

***«Звярнулася да ўрача з закладзеным носам, насмаркам і болямі ў горле. Аднак тэрапеўт адкрываць бальнічны не стала, аргументаваўшы тым, што няма павышанай тэмпературы. Няўжо высокая тэмпература — адзіная нагода, калі чалавек лічыцца непрацаздольным?»***

***Анастасія**, г. Гомель.*

**Адказвае ўчастковы ўрач-тэрапеўт, загадчык 2-га тэрапеўтычнага аддзялення 31-й гарадской паліклінікі г. Мінска Наталля ФІЛОНАВА.**

— Калі размова ідзе пра прастудныя і вірусныя захворванні, то высокая тэмпература, болі ў горле і ламота ў целе, кашаль, закладзены нос, іншыя сімптомы рыніту аб'ектывізуюць выдачу лісткоў непрацаздольнасці згодна з інструкцыяй. Тэмпература цела сапраўды павінна быць павышаная — 37,4 і вышэй. А 37,1—37,2 часам з'яўляюцца варыянтам нормы. З тэмпературай 36,8 і заложанасцю ў носе няма паказанняў для выдачы лістка непрацаздольнасці згодна з інструкцыяй. Але часам, калі сімптомаў недастаткова, пацыента неабходна даабследаваць. Тым больш, што ёсць людзі, у якіх тэмпература пры запаленчых працэсах не павышаецца. Тады ўрач накіроўвае на тэрміновы аналіз крыві. Калі паказчыкі ў норме, нагоды для бальнічнага няма. У такім выпадку мы выдаём пацыенту даведку аб стане здароўя, дзе пазначана, што ён звярта̀ўся ў паліклініку, каб не было праблем на рабоце. Калі пэўныя паказчыкі ў аналізе крыві павышаныя, выдаём лісток непрацаздольнасці. Цяпер бываюць выпадкі схаванай пнеўманіі, калі не ўдаецца яе дыягнаставаць падчас агляду: няма павышанай тэмпературы, але пацыент адчувае слабасць. Накіроўваем на флюараграфію, і калі ёсць змены запаленчага характару, інфільтрацыя ў лёгкіх, таксама выдаём лісток непрацаздольнасці. Часам пацыент прыходзіць з гіперэміраваным тварам, закладзеным носам, вострым танзілітам, але няма тэмпературы — і ў такіх выпадках таксама выдаём лісток непрацаздольнасці.

Здараецца, што пацыент не згодны з рашэннем участковага ўрача. Тады робім агляд сумесна з загадчыкам аддзялення, потым прадстаўляем яго вынікі на ўрачэбна-кансультацыйную камісію і сумесна прымаем рашэнне аб працаздольнасці ■

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

■ Незвычайнае побач

# СТРЭС ДЛЯ ЛІЛЕІ,

## або Прадчуванне вясны для тых, хто бачыць незвычайную кветку колеру добрага старога каньяку



